# Паводле Марка сьв. Эвангельле

# Паводле Марка сьв. Эвангельле

## Разьдзел 1.

1. Пачатак Эвангельля Ісуса Хрыста, Сына Божага.

2. Як напісана ў прарокаў: вось я пасылаю Ангела Майго перад абліччам Тваім, які пракладзе дарогу Тваю перад Табою (Малах. 3, 1).

3. Голас гукаючага ў пустыні: гатуйце дарогу Госпаду, простымі рабеце сьцежкі Яго (Ісая 40, 3).

4. Зьявіўся Іоан, хрысьцячы ў пустыні і абвяшчаючы пакутнае хрышчэньне дзеля адпушчэньня грахоў.

5. І выходзілі да Яго ўся старана Юдэйская і Ерузалімцы, і хрысьціліся ад Яго ў рацэ Іордане, спавядаючыся з грахоў сваіх.

6. І быў Іоан адзеты ў вярблюдавы волас і ў скураны пояс на паясьніцы сваёй, і еў саранчу ды дзікі мёд.

7. І прапаведываў кажучы: ідзе за мною Дужэйшы за мяне, у Якога я ня варт, нахіліўшыся, разьвязаць рамень абуцьця Яго.

8. Я хрысьціў вас вадою, а Ён будзе хрысьціць вас Духам Сьвятым.

9. І сталася ў тыя дні, прыйшоў Ісус з Назарэту Галілейскаго і хрысьціўся ад Іоана ў Іордане.

10. І, як выходзіў із вады, тут жа ўглядзіў Іоан расчыняючыся неба й Духа, як галуба, зыходзячы на Яго.

11. І голас быў з неба: Ты Сын Мой улюблены, Якому спагадаю.

12. І зараз Дух павёў Яго ў пустыню.

13. І быў Ён там у пустыні сорак дзён спакушаны ад сатаны, і быў з зьвярамі, і Ангелы служылі Яму.

14. Пасьля-ж таго, як Іоан быў выданы, прыйшоў Ісус у Галілею, прапаведуючы Эвангельле царства Божага

15. І кажучы, што споўніўся час і наблізілася царства Божае пакайцеся і верце ў Эвангельле

16. Праходзячы-ж ля мора Галілейскага, углядзіў Сымона і Андрэя, брата ягонага, як закідалі сеці ў мора, бо яны былі рыбаловы.

17. І сказаў ім Ісус: ідзеце за Мною, і Я зраблю вас лаўцамі людзей.

18. І яны той жа час пакінулі свае сеці і пайшлі за Ісусам.

19. І, адыйшоўшы адтуль недалёка, Ён углядзіў Якава Завядзеявага і Яна, брата ягонага, таксама ў чаўне, праўючы сеці.

20. І тут жа клікнуў іх. І яны, пакінуўшы бацьку свайго Завядзея ў чаўне з работнікамі, пайшлі за Ім.

21. І прыходзяць у Капэрнаум, і, неадкладаючы, у суботу ўвайшоў Ён у школу і навучаў



22. І дзівіліся з Яго навукі, бо, навучаючы іх, быў як той, хто мае ўладу, а не як кніжнікі.

23. І быў у школе іхняй чалавек, якім заўладаў дух нячысты, і закрычэў:

24. Пакінь! што Табе да нас, Ісус Назарэйскі? Ты прыйшоў згубіць нас! Ведаю цябе, хто ты, Сьвяты Божы!

25. Але Ісус пагразіў яму, кажучы: маўчы і выйдзі з яго.

26. Тады нячысты дух, устросшы яго і загаласіўшы моцным голасам, выйшаў з яго.

27. І ўсе спужаліся і пыталіся адзін у аднаго: што гэта? што гэта за новая навука, што сваёй уладай і духам нячыстым загадвае, і яны слухаюцца Яго?

28. І хутка разыйшлася аб Ім чутка па ўсіх ваколіцах Галілеі.

29. Выйшаўшы ўраз жа із школы, прыйшлі ў дом Сымона і Андрэя, з Якавам і Іоанам.

30. Цешча-ж Сымонавая ляжала ў гарачцы; і зараз кажуць Яму аб ёй.

31. Падыйшоўшы, Ён падняў яе, узяўшы за руку, і гарачка пакінула яе, і яна пачала служыць ім.

32. Калі-ж настаў вечар, як зайшло сонца, прыносілі да Яго ўсіх нядужых і апанаваных злым духам.

33. І ўсё места сабралося перад дзьвярыма.

34. І Ён аздаравіў многіх, цярпеўшых ад розных хвораў, і выгнаў духаў; і не пазваляў злым духам гаварыць, што яны пазналі Яго.

35. А нараніцы, устаўшы дужа рана, выйшаў і пайшоў у пустыннае месца і там маліўся.

36. Сымон і бышыя з імі пайшлі за Ім;

37. І, знайшоўшы Яго, кажуць Яму: ўсе шукаюць Цябе.

38. Ён кажа ім: пойдзем у бліжэйшыя сёлы і месты, каб Мне й там навучаць, бо-ж Я дзеля таго прыйшоў.

39. І Ён навучаў у школах іхніх скрозь па ўсёй Галілеі і выганяў злых духаў.

40. Прыходзіць да Яго пракажоны, молючы Яго і падаючы перад Ім на калені, дый кажа Яму: калі хочаш, можаш мяне ачысьціць.

41. Ісус жа, зьлітаваўшыся над ім, працягнуў руку, даткнуўся да яго і сказаў яму: хачу, будзь чысты!

42. І, як толькі Ён сказаў гэта, праказа тут жа зыйшла з яго, і ён ачысьціўся.

43. І, грозна глянуўшы на яго, зараз жа адаслаў яго

44. І сказаў яму: глядзі, нікому нічога не кажы, але пайдзі пакажыся сьвяшчэньніку і ахвяруй за ачышчэньне твае, што загадаў Майсей, дзеля сьведчаньня ім.

45. А ён, выйшаўшы, пачаў многа гаварыць і шырыць кругом вестку, дзеля чаго Ісус ня мог ужо ўвайсьці адкрыта ў места, але быў вонках, у мясцох пустынных. І прыходзілі да Яго зусюль

## Разьдзел 2.

1. Праз колькі дзён ізноў прыйшоў Ён у Капэрнаум, і разыйшлося, што Ён у доме.

2. Зараз сабралося гэтулькі народу, што ўжо і ля дзьвераў

ня было мéсца; і Ён гаварыў
ім слова.
3. І прыйшлі да Яго з спаралі-
жавáным, якога нéсьлі чаць-
вёра;
4. і, ня маючы магчымасьці
прыйсьці да Яго цераз народ,
раскрылі страхý дому, дзé Ён
быў, і, зрóбіўшы дзіру, спусь-
цілі пасьцéль, на якой ляжаў
спаралíжаваны.
5. Ісус, бáчучы вéру іх, кажа
паралітыку: дзіця, даруюцца
табé грахі твае.
6. Тут жа сядзéлі некаторыя
з кніжнікаў і разважалі ў сэр-
цах сваіх:
7. што гэта ён гэтак блюзь-
ніць? Хто можа даравáць
грахі, апрача аднаго Бога?
8. Ісус, ураз жа давéдаўшыся
духам Сваім, што яны гэтак
думаюць сабé, сказаў Ім: на
што гэтак думаеце ў сэрцах
вашых?
9. Што лягчэй? ці сказаць
паралітыку: даруюцца табé
грахі? ці сказаць: устань, вазь-
мі ложак свой і хадзі?
10. Але, каб вы вéдалі, што
Сын Чалавéчы мáе ўладу на
зямлі даравáць грахі, — ка-
жа паралітыку:
11. Табé кажу: устáнь, вазь-
мі ложак твой ды йдзі ў дом
твой.
12. Той ураз жа ўстаў і, узяў-
шы ложак, выйшаў перад
усімі, так што ўсé дзівіліся і
славілі Бога, кажучы: ніколі
нічога такога мы ня бачылі.
13. І выйшаў Ісус ізноў да
мора; і ўвéсь народ пайшоў да
Яго, і Ён навучаў іх.
14. Праходзячы, углéдзіў Ён
Лéвія Алфéявага, сядзючы на
мытніцы, і кажа яму: ідзі за
Мною. І той, устаўшы, пай-
шоў за Ім.
15. І стáлася, калі Ісус ся-
дзéў за сталом у доме ягоным,
пасядáлі з Ім і вучнямі Яго
шмат мытнікаў ды грэшнікаў,
бо было іх многа, і яны йшлі за
Ім.
16. Кніжнікі й фарысэі, углé-
дзіўшы, што Ён éсьць з мытні-
камі ды грэшнікамі, кажуць
вучням Яго: як гэта Ён éсьць і
п'éць з мытнікамі ды грэшніка-
мі?
17. Пачуўшы гэтае, Ісус ка-
жа ім: нé здарóвым трэба лé-
кара, але хворым. Я прый-
шоў клікаць нé сьвятых, але
грэшнікаў да пакуты.
18. А вучні Іоанавы і фары-
сэйскія пасьцілі, і прыходзяць
да Яго ды кажуць: чаму вуч-
ні Іоанавы ды фарысэйскія
посьцяць, а Твае вучні ня
посьцяць?
19. І сказаў Ім Ісус: ці мо-
гуць пасьціць сыны вясéльля,
калі з імі жаніх? Пакуль ма-
юць сярод сябé жаніхá, ня мо-
гуць пасьціць.
20. Але прыйдуць дні, калі
вóзьмуць ад іх жаніхá, і тады
будуць пасьціць у тыя дні.
21. І ніхто не прышывае лá-
пінкі з новай тканіны да ста-
рое адзéжыны, бо новая лá-
пінка адарвéцца ад старóга, і
дзірá будзе яшчэ бóльшая.
22. І ніхто не налівае нóвага
віна ў старыя мяхі, бо новае
віно прарвé мяхі, і віно вы-
цяча, ды мяхі прападуць; але
віно новае трэба ўлівáць у но-
выя мяхі.
23. І давялóся перахóдзіць
Яму ў суботу цéраз засéвы; і
пачалі вучні Ягоныя дарогаю
рваць калóсьсе.
24. Фарысэі сказалі Яму: гля-
дзі, чаму яны робяць у суботу
тое, чаго ня сьлéд рабіць?



25. Ён сказаў ім: няўжо-ж
вы ніколі ня чыталі, што зра-
біў Давід, калі мéў патрэбу й
галадáў сам ды быўшыя з ім?
26. Як увайшоў ён у дом
Божы за архірэя Авіафáра ды
éў хлябы ахвярныя, якіх ня
можна было éсьці нікому, ап-
рача сьвяшчэньнікаў, і даў і
тым, што былі з ім.
27. І сказаў ім: субота для
чалавéка, але нé чалавéк для
суботы;
28. вось чаму Сын Чалавечы
ёсьць гаспадар і над суботай.

### Разьдзéл 3.

1. І прыйшоў ізноў у школу;
і быў там чалавéк, які мéў су-
хую руку.
2. І сачылі за Ім, ці не azда-
равіць яго ў суботу, каб абві-
навáціць Яго.
3. І кáжа да сухарукага ча-
лавéка: стань пасярэдзіне.
4. І кажа да іх: Ці налéжыць
рабіць у суботу добрае, ці ра-
біць благое? Жыцьцё ратавáць,
ці загубіць? Яны маўчалі.
5. І, глянуўшы на іх з гне-
вам, тýжачы аб жóрсткасьці
сэрцаў іхніх, кажа таму чала-
вéку: працягні руку тваю.
Ён працягнуў, і зрабілася ру-
ка ягоная здаровая, як і дру-
гая.
6. Фарысэі, выйшаўшы, зараз
жа склікалі з Ірадзіянамі раду
аб Ім, каб загубіць Яго.
7. Але Ісус з вучнямі Сваімі
адыйшоўся да мора, і за Ім
пайшло множства народу з Га-
лілéі, Юдэі,
8. Ерузаліму, Ідумэі і з-за Іор-
дану; дый з ваколіц Тыру й
Сідону вялікай грамадой, па-
чуўшы, што Ён рабіў, ішлі да
Яго.
9. І сказаў вучням Сваім, каб
для Яго быў прыгатавáны чó-
вен, з увагі на мнóжства на-
роду, каб ня ціснуліся да Яго.
10. Бо многіх Ён аздаравіў,
дык хворыя ціснуліся да Яго,
каб дакрануцца да Яго.
11. І дýхі нячыстыя, бачучы
Яго, пáдалі перад Ім ды кры-
чэлі, кажучы: Ты Сын Божы!
12. Але Ён крэпка пагразіў
Ім, каб не выяўлялі Яго.
13. І ўзыходзе на гарý і кліча
да Сябé, каго Сам хацéў; і
прыйшлі да Яго.
14. І выбраў з іх дванацца-
цёх, каб з Ім былі, і каб пасы-
лаць іх прапавéдываць,
15. ды каб мéлі ўладу azда-
раўляць ад хвóрасьцяў і выга-
няць дэманаў;
16. і даў Сымону імя Пётр;
17. і Якава Завядзéявага і
Іоана брата Якава, Ім даў
імéньні Боанэргéс, што зна-
чыць — сыны громавы,
18. і Андрэя, і Піліпа, і Баўт-
рамéя, і Мацьвéя, і Хамý, і
Якава Алфéявага, і Фадзéя, і
Сымона Кананіта,
19. ды Юду Іскарыёта, які й
прадаў Яго.
20. І прыходзяць у дом: і із-
ноў зыхóдзіцца народ, так што
ім немагчыма было і хлéба
паéсьці.
21. І, дачуўшыся, родныя Яго
пайшлі ўзяць Яго, бо апавядá-
лі, быццам Ён ня пры розуме.
22. А кніжнікі, што прыйшлі
з Ерузаліму, гаварылі, што Ён
мáе ў Сабé вэльзэвýла ды што
выганяе дэманаў імем іхняга
князя.
23. І, клікнуўшы іх, гаварыў
ім прыпóвесьцямі: як можа
сатана сатанý выганяць?
24. Калі царства разьдзéліц-
ца само ў сабé, ня можа ўста-
яць царства тое;

25. І калі дом разьдзéліцца сам у сабé, ня можа ўстаяць дом той;

26. і калі сатана́ падняўся на самога сябé ды разьдзяліўся, ня можа ўстаяць, але канéц яму.

27. Ніхто, увайшоўшы ў дом дужóга, ня можа абрабаваць дабра яго нага, пакуль ня зьвяжа дужóга, і тады абрабуе дом яго ны.

28. Запраўды кажу вам: будуць дарава́ны сынóм чалавéчым усé грахі і хулы́, якімі-б яны ні хулілі;

29. але хто будзе хуліць Ду́ха Сьвятога, таму ня будзе дарава́на ніколі, але падлягáе вéчнаму асуджэньню.

30. Бо казалі: у Ім нячысты дух.

31. І прыйшлі браты і маці Яго і, стóячы вóнках, паслалі да Яго клікаць Яго.

32. І сядзéў каля Яго народ. І сказалі Яму: вось маці твая і браты твае на падвóрку пытаюць Цябé.

33. І сказаў ім, мовячы: хто маці Мая ці браты Мае?

34. І, глянуўшы наўкола на сядзéўшых ля Яго, кажа: вось маці Мая і браты Мае;

35. бо хто выпаўняцімець волю Божую, той Мнé і брат, і сястра, і маці.

### Разьдзéл 4.

1. І ізноў пачаў навучаць над морам; і сабралося да Яго такое множства народу, што Ён увайшоў у човен і сядзéў у моры, а ўвéсь народ быў на зямлі ля мора.

2. І навучаў іх шмат прыпóвесьцямі, і ў навуцы сваéй гаварыў ім:

3. Слухайце: вось выйшаў сéйбіт сéяць.

4. І сталася, як сéяў, што іншае ўпала пры дарозе, і наляцéлі птушкі нябéсныя ды падзёўбалі тое;

5. іншае ўпала на камéнны грунт, дзé мала было зямлі, і хутка ўзыйшло, бо зямля была няглыбокая;

6. калі-ж узыйшло сонца, завя́ла ды, ня ма́ючы караня́, засохла.

7. Іншае ўпала між шыпшы́ньнікам, і шыпшы́ньнік вы́рас і заглушы́ў яго, і яно не дало плёну;

8. іншае ўпала на добрую зямлю і дало плён, што ўзыйшоў і вырас, і ўрадзіла іншае трыццаць, іншае шэсьцьдзесят, іншае сто.

9. І сказаў ім: хто мáе вушы чуць, няхай чуе.

10. Калі-ж Ён быў Сам, акружаўшыя Яго разам з дванаццацьма спыталіся ў Яго аб прыпóвесьці.

11. І сказаў ім: вам да́дзена вéдаць тайны царства Божага, а тым вонках усё стаéцца ў прыповесьцях,

12. каб, глéдзячы вачы́ма, глядзéлі й ня бачылі; слу́хаючы, чулі й не разумéлі; каб не навярнуліся, ды каб ня былі дарава́ны ім грахі іхнія.

13. І кажа ім: не разумéеце гэтае прыпóвесьці? Як жа вам зразумéць усé прыпóвесьці?

14. Сéйбіт слова сée.

15. Вось жа тыя, што ля дарогі, дзé сéецца слова, як толькі пачуюць яго, дык ураз жа сатана́ й вырывае слова, пасéянае ў сэрцах іх.

16. Таксама й тыя, што пасéяны на камяністым мéсцы, якія,ледзь пачуюць слова, зараз з ра́дасьцю прыймаюць яго,

17. ды ня маюць у сабé караня, дык дачэсныя: як толькі прыйдзе ўціск ці перасьлéдаваньне за слова, зараз спакушаюцца.

18. І тыя, што ў шыпшы́ньніку пасéяны, гэта тыя, што чуюць слова,

19. але ў якіх гурботы гэтага вéку, прына́да багацьця ды іншыя пажаданьні, уваходзячы ў іх, глу́шаць слова, і яно стаéцца бясплодным.

20. І што пасéяна на добрай зямлі, гэта тыя, якія слу́хаюць слова і прыймаюць яго і даюць плён: адзін у трыццаць, другі ў шэсьцьдзесят, іншы ў сто разоў.

21. І сказаў ім: ці на тое прыносіцца сьвятло, каб паставіць яго пад пасу́дзіну ці пад ложак, а не на тое, каб паставіць яго на сьвéтачу?

22. Бо няма нічога тайнага, каб не зрабілася яўным: бо ня сталася дзеля ўкрываньня, а каб вы́явілася.

23. Калі хто мае вушы чуць, няхай чуе.

24. І сказаў ім: заўважайце, што чуеце: якою мéраю мéраеце, гэткаю й вам адмéрана будзе і дададзена будзе вам, што слухаеце.

25. Бо хто мае, таму будзе да́дзена, а хто ня мáе, у таго адымецца й тое, што мáе.

26. І сказаў: гэтак ёсьць царства Божае, як калі чалавéк кідае зéрне ў зямлю,

27. і сьпіць, і ўстаé ўначы і ўдзéнь, і насéньне ўзыходзіць і расьцé, што ён ня вéдае;

28. бо зямля́ сама́ сабою родзіць сьпярша рунь, пасьля колас, пасьля зéрне ў коласе.

29. Калі-ж дасьпявáе плён, ураз жа шлéць сéрп, бо надыйшло жніво́.

30. І сказаў: да чаго падобна царства Божае? Ці якою прыпóвесьцю вы́кажам яго?

31. Яно як зéрне гарчы́чнае, якое, калі сéецца ў зямлю, дык ёсьць мéншае за ўсé зярнаты на зямлі,

32. а калі пасéяна, узыходзіць і робіцца бльшым за ўсé расьліны і пускае такія вялікія галіны, што пад цéнем яго могуць хава́цца пта́хі нябéсныя.

33. І многімі гэткімі прыпóвесьцямі казаў ім слова, колькі яны маглі слухаць;

34. бяз прыпóвесьці-ж нé гаварыў нічога, а вучням насамóце тлумачыў усё.

35. Увéчары таго-ж дня сказаў ім: пераплывéм на той бок.

36. І яны, адправіўшы народ, узялі Яго з сабою, як быў у чаўнé, бо з Ім былі і другія чаўны́.

37. І ўзьнялася вялікая бу́ра; хвáлі білі ў чóвен так крэпка, што ўжо пачаў напаўняцца вадою.

38. А Ён спаў на кармé на падушцы. Яго будзяць ды кажуць да Яго: Вучыцель! Няўжо-ж Цябé ня ру́піць, што мы гінем?

39. І, падыймаючыся, забараніў вéтру і кажа да мора: змоўкні, пакінь! І вéцер заціх, і настала вялікая ціша.

40. І кажа ім: чаму вы гэткія палахлівыя? як гэта ў вас няма́ вéры?

41. І спалохаліся вялікім страхам ды гаварылі між сабою: Хто гэта, што й вéцер і мора слу́хаюцца загаду Яго?

## Разьдзел 5.

1. І прыйшлі на той бок мора, у старану Гадарэнскую.

2. І, калі выйшаў Ён з чаўна, зараз жа пераняў Яго чалавек з магільніку, апанаваны нячыстым.

3. Ён меў жыльлё ў магілах; і ніхто ня мог яго зьвязаць навет ланцугамі,

4. бо многа разоў скоўвалі яго путамі ды ланцугамі, але ён разрываў ланцугі і разьбіваў путы, і ніхто ня меў сілы супакоіць яго;

5. заўсёды ўначы і ўдзень ён быў у горах ды ў магілах, крычучы і б'ючы сябе каменьмі.

6. Углядзіўшы-ж Ісуса здалёку, прыбег ды пакланіўся Яму

7. і, закрычэўшы моцным голасам, сказаў: што Табе да мяне, Ісус, Сын Бога Усявышняга? Заклінаю Цябе Богам, ня муч мяне!

8. (Бо Ісус казаў яму: выйдзі, дух нячысты, з гэтага чалавека).

9. І спытаўся ў яго: як імя тваё? І ён сказаў у адказ: легіён імя маё, бо нас многа.

10. І дужа прасіў Яго, каб не высылаў іх вон з стараны тае.

11. Пасьвіўся-ж там ля гары вялікі гурт сьвіней.

12. І прасілі Яго ўсе дэманы: пашлі нас у сьвіней, каб нам увайсьці ў іх.

13. Ісус ураз жа дазволіў ім. І нячыстыя духі, выйшаўшы, увайшлі ў сьвіней, і кінулася стада з кручы ў мора; было-ж каля дзьвёх тысячаў; і патанулі ў моры.

14. А тыя, што пасьвілі сьвіней, пабеглі ды абвясьцілі ў месьце і па вёсках. І жыхары выйшлі паглядзець, што сталася.

15. Прыходзяць да Ісуса ды бачаць, што апанаваны дэманамі, у якім быў іх легіён, сядзіць, адзеты, пры здаровым розуме; дык спалохаліся.

16. І бачыўшыя расказалі ім, як сталася з апанаваным дэманамі, ды аб сьвіньнях.

17. І пачалі прасіць Яго адыйсьці ад межаў іхніх.

18. І, калі Ён увайшоў у човен, дык той, што быў апанаваны дэманамі, папрасіўся быць з Ім.

19. Але Ісус не дазволіў яму і кажа да яго: ідзі дамоў да сваіх ды раскажы ім, што зрабіў табе Госпад і як зьлітаваўся над табою.

20. І пайшоў ды пачаў апавядаць у Дзесяціградзьдзі, што зрабіў з ім Ісус. І ўсе дзівіліся.

21. Калі Ісус ізноў перабраўся ў чаўне на другі бераг, сабралося да Яго множства народу. І быў Ён ля мора.

22. І вось прыходзіць адзін із школьных старшын, на імя Яір, і, углядзіўшы Яго, падае да ног Ягоных

23. і вельмі просіць Яго, кажучы: дачка мая ўмірае: прыйдзі, палажы на яе рукі, каб яна паздаравела і жыла.

24. І пайшоў з ім. І за Ім ішло шмат народу і ціснулі Яго.

25. І нейкая жанчына, якая цярпела ад крывацечы дванаццаць гадоў

26. ды шмат выцярпела ад многіх дахтароў і патраціла на іх усё, ня маючы ніякае палёгкі, ды йшчэ больш хворая,

27. пачуўшы пра Ісуса, падыйшла ззаду між народам і дакранулася да вопраткі Ягонае,

28. бо казала: калі хоць да вопраткі Яго дакрануся, паздаравею

29. І зараз задзяржалася ў яе крывацеча, і пачула яна ў целе сваім, што паздаравела ад хвorасьці

30. У той жа час Ісус, пачуўшы Сам у Сабе, што выйшла з Яго сіла, зьвярнуўся да народу і сказаў: хто дакрануўся да Мае адзежы?

31. Вучні сказалі Яму: Ты бачыш, што народ тоўпіцца ля Цябе, і пытаешся: хто дакрануўся да Мяне?

32. Але Ён агледнуўся наўкола, каб бачыць тую, што зрабіла гэта

33. Жанчына-ж, спалохаўшыся і дрыжучы, бо ведала, што з ёю сталася, падыйшла, упала перад Ім і сказала Яму ўсю праўду

34. Ён жа сказаў ёй: дачка! вера твая збавіла цябе. Ідзі ў супакоі і будзь здарова ад хваробы тваёй.

35. Ён яшчэ гаварыў, калі прыходзяць ад школьнага старшыні ды кажуць: дачка твая памёрла; на што яшчэ турбуеш вучыцеля?

36. Але Ісус, ураз пачуўшы гавораныя словы, кажа да старшыні школы: ня бойся, толькі вер!

37. І не дазволіў нікому йсьці за Сабою, апрача Пятра, Якава і Іоана, брата Якавага.

38. Прыходзіць у дом старшыні школы і бачыць трывогу, плач ды лямант вялікі.

39. І, увайшоўшы, кажа ім: чаго трывожыцеся ды плачаце? Дзяўчына ня ўмерла, але сьпіць.

40. І сьмяяліся з Яго. Але Ён, выслаўшы ўсіх, бярэ з Сабою бацькоў дзяўчыны і быўшых з Ім ды ўваходзіць туды, дзе ляжала дзяўчына

41. І, узяўшы дзяўчыну за руку, кажа да яе: Таліта, кумі! што значыць дзяўчына, табе кажу, устань!

42. І ўраз жа ўстала дзяўчына і пачала хадзіць, а было ёй дванаццаць гадоў. І здумеліся ад дзіва вялікага

43. І Ён цьвёрда прыказаў ім, каб ніхто аб гэтым ня ведаў; і сказаў даць ёй есьці.



## Разьдзел 6

1. І выйшаў адтуль і прыйшоў у сваю бацькаўшчыну; і за Ім ішлі вучні Ягоныя.

2. І, калі настала субота, пачаў вучыць у школе; і многія, чуючы, з задзіўленьнем гаварылі: адкуль у Яго гэтае? І што за мудрасьць дадзена Яму, што і гэткія цуды чыняцца рукамі Яго?

3. Ці-ж гэта ня цесьля, сын Марыі, брат Якава, Есіі, Юды і Сымона? Ці-ж гэта ня сёстры Ягоныя, што пасярод нас? І сумляваліся ў Ім.

4. Ісус жа сказаў ім: ня бывае прарок без пашаны, хіба толькі ў сваёй бацькаўшчыне і ў родных і ў доме сваім.

5. І ня мог там учыніць ніякага цуду, толькі некаторых хворых, усклаўшы рукі на іх, аздаравіў.

6. І дзівіўся з недаверства іх. І хадзіў па вакалічных сёлах, навучаючы.

7. І паклікаў тых дванаццацёх і пачаў іх слаць па двое і даў ім уладу над нячыстымі духамі.

8. І сказаў ім нічога ня браць

у дарогу, апрача аднаго кія: ні торбы, ні хле́ба, ні ме́дзі ў поясе,

9. адно абувацца ў пасталы і не апранацца ў дзьве́ вопраткі.

10. І сказаў ім: калі дзе ўвойдзеце ў дом, астава́йцеся ў ім, дакуль ня вы́йдзеце стуль;

11. і калі хто ня пры́ме вас і ня будзе слухаць вас, выходзячы адтуль, абтрасе́це пыл з ног вашых на сьвядоцтва ім. Запраўды́ кажу вам: лягчэй будзе Садому й Гаморы ў дзе́нь суда́, чымся ме́сту гэнаму.

12. І, пайшоўшы, прапаве́дывалі, каб ка́яліся;

13. і выганялі многа дэманаў і многіх хворых ма́залі аліваю і лячылі.

14. І дачуўся цар Ірад (бо імя Ягонае сталася ве́дама) і сказаў: гэта Іоан Хрысьціцель уваскрос, і дзеля гэтага цуды праз Яго дзеюцца.

15. Другія гаварылі: гэта Ільля; а іншыя казалі: гэта прарок, ці адзін із прарокаў.

16. Ірад жа, пачуўшы, сказаў: гэта Іоан, якому я сьцяў галаву; ён паўстаў із мёртвых.

17. Бо гэты Ірад, паслаўшы, схапіў быў Іоана і зьвязаў Яго ў вязьніцы за Ірадзіяду, жану́ брата свайго Піліпа, што ўзяў яе́ за жонку.

18. Бо Іоан сказаў Іраду: ня гожа табе́ ме́ць жонку брата твайго.

19. Ірадзіяда, злуючы́ на яго, жадала забіць яго, ды не магла,

20. бо Ірад баяўся Іоана, ве́даючы яго, як чалаве́ка справядлівага ды сьвятога, і сьцярог яго; дый шмат рабіў, слу́хаючыся яго, і слухаў яго з ахвотаю.

21. І, як нада́рыўся дзе́нь, калі Ірад, з прычыны сваіх урадзін, справіў банке́т сваім вяльможам, ваяводам ды іншым людзям Галілеі,

22. дык дачка́ Ірадзіяды ўвайшла і танцавала й дагадзіла Іраду і банкетава́ўшым з ім. І сказаў цар дзяўчыне: прасі ў мяне́, чаго хочаш, і дам табе́.

23. І прысягнуў ёй: чаго папросіш у мяне́, дам табе́, хоць бы палову царства майго.

24. Яна выйшла і спыталася ў маткі сваёй: чаго прасіць? Тая адказала: галаву Іоана Хрысьціцеля.

25. І ўраз жа, вярнуўшыся борзда да цара́, папрасіла, ка́жучы: хачу, каб ты даў мне́ цяпе́р жа на місе галаву Іоана Хрысьціцеля.

26. Цар, хоць і зажуры́ўшыся, але дзеля прысягі і тых, што банкетава́лі з ім, не схаце́ў ёй адмовіць.

27. І цар, ура́з жа паслаўшы ка́та, загада́ў прыне́сьці галаву ягоную.

28. Той, пайшоўшы, сьцяў яго ў вязьніцы і прынёс галаву ягоную на́ місе і аддаў яе́ дзяўчыне, а дзяўчына аддала яе́ матцы сваёй.

29. І, дачуўшыся, вучні яго прыйшлі і ўзялі це́ла ягонае ды палажылі яго ў магілу.

30. І сабраліся апосталы да Ісуса і расказалі Яму ўсё, і што зрабілі і чаго навучалі.

31. І сказаў ім: пайдзе́це адны ў пустыннае ме́сца ды крыху супачы́ньце. Бо так многа было, што прыхо́дзілі й адыхо́дзілі, дый е́сьці ім было не́калі.

32. І паплылі ў пустыннае ме́сца ў чаўне́ адны.

33. Народ угле́дзіў іх е́дучы,



многія пазналі; і бе́глі туды пе́ша з усіх ме́стаў і апярэдзілі іх дый зыйшліся да Яго.

34. Ісус, вы́йшаўшы, угле́дзіў множства народу ды пашкадава́ў іх, бо яны былі, як аве́чкі бяз па́стыра; і пачаў навучаць іх многа.

35. І, як прайшло шмат часу, вучні Яго прыйшлі да Яго дый кажуць: ме́сца тут пустыннае, а час ужо позны.

36. Пусьці іх, каб, пайшоўшы ў вакалічныя вёскі й сёлы, купілі сабе́ хле́ба, бо ня маюць чаго е́сьці.

37. Ён жа адказваючы сказаў ім: вы́ дайце ім е́сьці. І сказалі Яму: хіба нам пайсьці купіць хле́ба дынараў на дзьвесьце й даць ім е́сьці?

38. Але Ён спытаўся ў іх: колькі ў вас хлябоў? Пайдзе́це й паглядзе́це. Яны, даве́даўшыся, сказалі: пяць хлябоў і дзьве́ рыбы.

39. Тады загадаў ім рассадзіць усіх гурткамі на зялёнай траве́.

40. І паселі радамі па сто ды па пяцьдзесят.

41. І, узяўшы пяць хлябоў і дзьве́ рыбы, паўзіраўшыся на не́ба, багаславіў і палама́ў хлябы́ і даў вучням Сваім, каб яны раздалі ім; і дзьве́ рыбы падзяліў усім.

42. І е́лі ўсе́ і нае́ліся.

43. І набралі кускоў хле́ба дванаццаць поўных карабо́ў і аста́ткаў ад рыбы.

44. А было е́ўшых хле́б каля пяцёх тысячаў людзе́й.

45. І зараз прымусіў вучняў сваіх увайсьці ў чо́вен ды плыці напе́рад на той бе́раг да Віфсаіды, пакуль Ён распусьціць народ.

46. І, распусьціўшы іх, пайшоў на гару памаліцца.

47. І, як настаў ве́чар, чо́вен быў пасярэдзіне мора, а Ён адзін на зямлі.

48. І ўбачыў, як ім цяжка плыці, бо ве́цер быў супраціўны; дык каля чацьве́ртай старожы ўначы́ йдзе́ да іх, ступа́ючы па моры; і хаце́ў абмінуць іх.

49. Яны-ж, угле́дзіўшы Яго ідучы́ па моры, падумалі, што гэта здань, ды загаласілі.

50. Бо ўсе́ бачылі Яго і спалохаліся. Дык ураз жа прамо́віў да іх і сказаў ім: схамяне́цеся: гэта Я, ня бойцеся!

51. І ўвайшоў да іх у човен; і ве́цер заціх. І яны цераз ме́ру здуме́ліся ў сабе́ і дзівава́ліся.

52. Бо яны не зразуме́лі аб хлябох: бо сэрца іх было скамяне́ўшы.

53. І, пераплыўшы, прыйшлі ў зямлю Генісарэцкую і прысталі да бе́рагу.

54. І, як яны выйшлі з чаўна, за́раз пазнаўшыя Яго

55. абе́глі ўсю тую ваколіцу, і пачалі на ложках прынасіць нядужых туды, дзе́, як чулі, быў Ён.

56. І, куды Ён ні прыходзіў у сёлы, у ме́сты і ў вёскі, клалі хворых на плошчах і прасілі Яго, каб ім хоць да краю адзе́жы Яго дакрану́цца. І тыя, што дакрана́ліся да Яго, спасьліся.

### Разьдзе́л 7.

1. І сабраліся да Яго фарысэі й некаторыя з кніжнікаў, што прыйшлі з Еруzаліму;

2. І, убачыўшы некаторых з вучняў Яго, як е́лі хле́б нячыстымі (гэта значыць няўмытымі) рукамі, карылі іх.

3. Бо фарысэі і ўсé Юдэі, трымáючыся накáзаў старшых, не ядуць не памыўшы чыста рук;

4. і з торгу, пакуль не памыюцца, не ядуць. Ёсьць і многае іншае, чаго яны, пераняўшы, трымаюцца: мыцьцё чáраў, кубкаў, мéднага судзьдзя́ ды ўслонаў.

5. Пасьля пытаюцца ў Яго фарысэі ды кніжнікі: чаму вучні Тваі ня жывуць згодна з наказамі старшых, але нямытымі рукамі ядуць хлéб?

6. Ён жа, áдкáзваючы, сказаў ім: добра прарочыў аб вас, крывадушных, Ісая, калі пісаў: людзі гэтыя паважаюць Мянé вýснамі, а сэрца іх далёка ад Мянé.

7. Але дармá пакланяюцца Мнé, навучаючы навук і зáпаведзяў чалавéчых (Ісая 29, 13).

8. Бо вы, пакідаючы прыказаньне Божае, трымаецеся наказу чалавéчага, мыцьця чáраў і кубкаў, ды робіце шмат іншага, падобнага да гэтага.

9. І сказаў ім: ці добра, што вы адкідаеце прыказаньне Божае абы спаўняць ваш наказ?

10. Бо Майсéй сказаў: паважай айцá твайго і матку тваю: і хто зьневажáе айца ці матку, няхай сьмéрцяй памрэ (Выхад. 20, 12; 21, 16).

11. А вы кажаце: хто скажа айцу ці матцы: Корван, (гэта ёсьць — Дар), чым бы ад мянé карыстаўся,

12. таму дапускáеце ўжо нічога больш не рабіць для айцá свайго ці для маткі сваé,

13. адкідаючы слова Божае накáзам вашым, які вы пастанавілі; ды робіце шмат падобнага да гэтага.

14. І, паклікаўшы ўвéсь народ, кажа да іх: слухайце Мянé ўсé ды разумéйце.

15. Няма нічога, што, уваходзячы ў чалавéка звонку, магло бы зрабіць яго нячыстым; але тое, што выходзіць ад яго, — гэта тое, што робіць нячыстым чалавéка;

16. калі хто мáе вушы чуць, няхай чуе.

17. І калі Ён увайшоў у дом ад народу, вучні Ягоныя спыталіся ў Яго аб прыпóвесьці.

18. І сказаў ім: няўжо-ж і вы гэткія няцямкія? Няўжо-ж не разумéеце, што нішто, увахóдзячы ў чалавéка звонку, ня можа яго зрабіць нячыстым,

19. бо ня ў сэрца ягонае ўваходзіць, але ў жывот, і выходзіць вон, ачышчаючы ўсякую ёжу.

20. Дый сказаў: тое, што выходзе ад чалавéка, тое робіць яго нячыстым.

21. Бо з нутрá, з сэрца чалавéчага выходзяць благія думкі, распуста, блуд, душагубства,

22. крадзéжы, прагавітасьць, злосьць, здрáда, бязглуздасьць, ліхое вока, хулá, пыха, дурнота.

23. Усё тое благое з нутрá выходзіць і робіць нячыстым чалавéка.

24. І, устаўшы, пайшоў адтуль на ўзьмéжкі Тырскія й Сідонскія; і, увайшоўшы ў дом, не хацéў, каб хто давéдаўся; ды ўтаіцца ня здóлеў,

25. бо жанчына, дачкá якое мéла ў сабé нячыстага духа, пачуўшы аб Ім, прыйшоўшы ўпала да ног Ягоных;

26. а жанчына тая была пагáнка, родам Сірафінікіянка; і прасіла ў Яго, каб выгнаў нячыстага духа з дачкі яé.



27. Але Ісус сказаў ёй: дай пéрш насыціцца дзéцям, бо ня гожа ўзяць хлéб у дзяцéй і кінуць сабакам.

28. Яна ж адказала Яму і сказала: так, Госпадзе; але й сабакі пад сталом ядуць крошкі ад дзяцéй.

29. І сказаў ёй дзеля гэтага слова: ідзі! злы дух выйшаў з дачкі тваé.

30. І, прыйшоўшы ў свой дом, яна знайшла, што злы дух выйшаў, і дачкá ляжыць на ложку.

31. І, ізноў выйшаўшы з зямéль Тырскіх і Сідонскіх, пайшоў да мора Галілéйскага, пасярод Дзесяцігрáдзьдзя.

32. І прывялі да Яго глуханямóга ды прасілі Яго ўзлажыць на яго руку.

33. І, узяўшы яго ад народу, паклаў пальцы Свае ў вушы яму і, плюнуўшы, дакрануўўся да языка ягóнага;

34. і, глянуўшы ў нéба, уздыхнуў і сказаў яму: Эффафа! што знача: расчыніся!

35. І ўраз жа расчыніліся вýшы ягоныя і разьвязаліся путы языка ягонага, і пачаў добра гаварыць.

36. І загадаў ім не казаць нікому. Але колькі ні забараняў ім, яны яшчэ шырэй апавядалі.

37. І тым балéй дзівіліся ды гаварылі: ўсё добра зрабіў: робіць і глухія каб чулі, і нямыя каб гаварылі.

## Разьдзéл 8.

1. У тыя дні, як сабралося дужа многа народу і ня мéлі што éсьці, Ісус, клікнуўшы вýчняў Сваіх, кажа ім:

2. Шкадá Мнé народу, што ўжо тры дні са Мною і ня мáе штó éсьці.

3. І, калі пушчу іх дамоў няеўшы, аслабéюць у дарозе, бо некаторыя з іх прыйшлі здалёку.

4. І вучні Ягоныя адказалі Яму: скуль мог бы хто тут у пустыні накарміць іх хлéбам?

5. І спытаўся ў іх: колькі ў вас хлябоў? Яны сказалі: сéм.

6. І сказаў народу сéсьці на зямлю; і, узяўшы сéм хлябоў ды падзякаваўшы, паламаў і даў вучням Сваім, каб раздалі; і яны раздалі народу.

7. І мéлі яны нéкалькі рыбак; і, пабагаславіўшы, сказаў раздаць і тыя.

8. І éлі і насыціліся і набралі астаўшыхся кускоў сéм карабоў.

9. Еўшых жа было каля чатырох тысячаў. І распусьціў іх.

10. І, ураз увайшоўшы ў човен з вучнямі Сваімі, прыйшоў у мéжы Далмануфскія.

11. І выйшлі фарысэі ды пачалі з Ім спрачацца, дамагаючыся ад Яго знакóў з нéба, спакушáючы Яго.

12. І Ён, уздыхнуўшы ў душы Сваёй, сказаў: на што род гэты дамагаецца знакóў? Запраўды кажý вам, ня будзе дáдзены знак роду гэтаму.

13. І, пакінуўшы іх, ізноў увайшоў у чóвен і паплыў на той бок.

14. І забыліся ўзяць хлéба, і ня мéлі з сабою ў чаўнé хлéба, апрача аднаго бóхана.

15. Ён загадаў ім: глядзіце, сьцеражыцеся кісьлі фарысэйскай і кісьлі Ірадавай.

16. І разважалі між сабою, кажучы: гэта што хлéба ня маем.

17. І, вѐдаючы, Ісус кажа да іх: ці-ж яшчэ ня цямі́це й не разумѐеце? Ці йшчэ скамянѐўшы ма́еце сэрца вашае?

18. Маючы вочы, ня бачыце? Маючы вушы, ня чуеце? дый не памятаеце?

19. Калі Я пяць хлябо́ў паламаў на пяць тысячаў, колькі поўных карабоў кускоў назьбіралі вы? Кажуць Яму: дванаццаць.

20. А калі се́м для чатырох тысячаў, колькі карабоў назьбіралі вы астаўшыхся кускоў? Сказалі: се́м.

21. І сказаў ім: як жа не разумѐеце?

22. І прыходзе да Віфсаіды; і прыводзяць да Яго сьляпога ды просяць, каб дакрану́цца да яго.

23. І, узяўшы сьляпога за ру́ку, вы́веў яго за сяло і, плюнуўшы яму на вочы, паклаў на яго рукі ды спытаўся, ці што бачыць?

24. І той, зірнуўшы, адказаў: бачу людзѐй, што як дрэвы ходзяць.

25. Потым ізноў палажыў рукі на вочы яму ды зрабіў, каб бачыў. І паздаравѐў ды стаў бачыць усё ясна.

26. І паслаў яго дамоў, сказаўшы: не захо́дзь у сяло́ і не кажы́ нікому ў сялѐ.

27. І пайшоў Ісус з вучнямі Сваімі ў сёлы Кеса́рыі Піліпавай. І дарогаю Ён пытаўся ў вучняў Сваіх, кажучы: за каго лічаць Мянѐ людзі?

28. Яны адказалі: за Іоана Хрысьціцеля; другія-ж за Ільлю, а іншыя — за аднаго з прарокаў.

29. Ён жа кажа ім: а вы за каго лічыце Мянѐ? І Пётр адказаў Яму, кажучы: Ты Хрыстос.

30. І загадаў ім, каб нікому не гаварылі аб Ім.

31. І пачаў навучаць іх, што трэба, каб Сын Чалавѐчы многа вы́цярпеў, каб адцура́ліся ад яго старшы́ны і архірэі і кніжнікі, ды каб быў забіты і цераз тры дні ўваскро́с.

32. І гаварыў аб гэтым адкрыта. І Пётр, адклікаўшы Яго, пачаў кары́ць Яго.

33. А Ён, аглянуўўшыся й ба́чучы вучняў Сваіх, забараніў Пятру, сказаўшы: адыдзі ад Мянѐ, сатана́, бо думаеш не аб Божым, але аб чалавѐчым.

34. І, паклікаўшы народ з вучнямі Сваімі, сказаў ім: хто хоча ісьці за Мною, адракіся ад самога сябѐ і вазьмі крыж свой ды йдзі сьлѐдам за Мною;

35. бо хто хоча душу сваю спасьці, загу́біць яѐ; але хто загу́біць душу сваю за Мянѐ і Эва́нгельле, той спасѐ яѐ.

36. Бо што́ за кары́сьць чалавѐку, калі-б здабыў увѐсь сьвѐт, а душы́ сваёй шкоду ўчыніў бы?

37. Або што́ дасьць чалавѐк за душу сваю?

38. Бо хто пасаро́міцца Мянѐ і Маіх слоў перед родам гэтым блудным ды грэшным, дык і Сын Чалавѐчы пасаро́міцца яго, як пры́йдзе ў славе Айца Свайго з а́нгеламі сьвятымі.

### Разьдзѐл 9.

1. І сказаў ім: запраўды кажу вам: ёсьць некаторыя сярод тых, што тут стаяць, якія ня і́муць сьмѐрці, пакуль ня ўглѐдзяць царства Божага, пры́йшоўшага ў сіле.

2. І цераз шэсьць дзён бярэць Ісус Пятра, Якава і Іоана і вядзе на гару высокую асобна іх адных. і перамяніўся перад імі

3. І адзѐньне Яго зрабілася бліскучым ды такім бѐлым, як сьнѐг, ды як бялільшчык на зямлі ня можа вы́біяліць

4. І зьявіўся ім Ільля з Майсѐем ды вялі гутарку з Ісусам

5. І на гэта Пётр сказаў Ісусу: Раввіl добра нам тут быць; дык зробім тры палаткі: Табѐ адну, Майсѐю адну і Ільлі адну.

6. Бо ня вѐдаў, што сказаць, бо яны перапало́халіся.

7 І паўстала хма́ра, закрыўшая іх, і з хма́ры вы́йшаў голас, я́кі казаў: гэты ёсьць Сын Мой улю́блены, Яго слухайце.

8. І раптам, аглядзеўшыся наўкола, нікога больш ня ўбачылі, апрача аднаго Ісуса.

9. Калі-ж яны зыхо́дзілі з гары, загадаў ім нікому не казаць, што́ яны ба́чылі, дакуль Сын Чалавѐчы не ўваскрэсьне.

10. І захавалі гэтае слова, пытаючыся адзін у аднаго, што значыць: уваскрэснуць?

11 І спыталіся ў Яго, кажучы: кніжнікі гавораць, што пѐрш мусіць прыйсьці Ільля?

12. Ён жа адказаў ім: Ільля, прыйшоўшы пѐрш, наладзіць усё, як і напісана пра Сына Чалавѐчага, каб шмат перацярпѐў і быў паніжаны

13. Але кажу́ вам, што і Ільля прыйшоў, і ўчынілі з ім, што хацѐлі, як напісана пра Яго.

14. І, прыйшоўшы да вучняў, углѐдзіў многа народу ля іх, ды кніжнікаў, спрачаючыся з імі.

15. І, ураз углѐдзіўшы Яго, увесь народ здумѐўся ды, прыбягаючы, вітаў Яго.

16. І спытаўся Ён у кніжнікаў: аб чым у вас спрэчка з імі?

17 І, адказваючы, адзін із народу сказаў: Вучыцелю! я прывёў да Цябѐ сына майго, які ма́е нямо́га духа:

18. дзѐ ні схопіць яго, кідае яго на зямлю, і ён пѐніцца й скрыгіча зубамі сваімі ды пруцянѐе. І казаў я вучням Тваім, каб вы́гналі яго, і ня здо́лелі.

19 Ён жа, адка́зваючы, гавора: о, род нявѐрны! Дакуль буду з вамі? Дакуль буду цярпѐць вас? Прывядзѐце яго да Мянѐ!

20. І прывялі яго да Ісуса. І, уба́чыўшы Яго, дух затрос ім, і ён упаў на зямлю ды валяўся, пуска́ючы пѐну.

21 І спытаўся Ісус у бацькі ягонага: як даўно гэта зрабілася з ім? Той жа адказаў: з дзяцінства;

22 і шмат разоў дух кідаў яго ў вагонь ды ў ваду, каб загубіць яго; але, калі што можаш, памажы́ нам, зьлітаваўшыся над намі.

23. Ісус сказаў яму: калі можаш вѐрыць, усё магчыма для вѐруючага.

24. І зараз, загаласіўшы, бацька хлопца сказаў праз сьлёзы: Госпадзе! памажы́ майму недавѐрству!

25. Ісус жа, бачучы, што зьбягаецца народ, пагразіў духу нячыстаму, кажучы яму: дух нямы́ і глухі! Я прыка́зую табѐ: вы́йдзі з яго ды больш не ўваходзь у яго!

26. І, загаласі́ўшы ды крэпка затро́сшы ім, выйшаў; і зрабіўся, як няжывы́, так што многія гаварылі, што памёр.

27. Але Ісус, узяўшы яго за руку, падняў яго, і ён устаў.

28. І, як увайшоў у дом, вучні Ягоныя пыталіся ў Яго насамоце: чаму мы не маглі выгнаць яго?

29. І сказаў ім: гэты род ніяк ня можа выйсьці, адно толькі ад малітвы ды посту.

30. І, пайшоўшы стуль, праходзілі праз Галілéю, і Ён не хацéў, каб хто давéдаўся.

31. Бо навучаў Сваіх вучняў і гаварыў ім, што Сын Чалавéчы вы́даны будзе ў рукі людзéй, і заб'юць Яго, і забіты ўваскрэсьне на трэці дзéнь.

32. Але яны не разумéлі слоў, а спытацца ў Яго баяліся.

33. І прыйшоў у Капэрнаум; і, як быў у доме, спытаўся ў іх: аб чым дарогаю вы гутарылі між сабою?

34. Яны-ж маўчалі, бо дарогаю разважалі між сабою, хто большы.

35. І, сéўшы, паклікаў дванаццацёх і сказаў ім: калі хто хоча пéршым быці, будзь з усіх апошнім і для ўсіх слугою.

36. І, узяўшы дзіця, паставіў яго сярод іх ды, абняўшы яго, сказаў ім:

37. Хто пры́йме адно з гэтых дзяцéй дзеля Мянé, той прыймáе Мянé, а хто Мянé пры́йме, то не Мянé прыймáе, але Паслаўшага Мянé.

38. І адказаў Яму Іоан, мóвячы: Настаўнік! мы бачылі чалавéка, які Тваім імем выганяе дэманаў, а ня йдзéць за намі; дык забаранілі яму, бо ня йдзéць за намі.

39. Ісус жа сказаў: не забараня́йце яму, бо няма такога, хто, учыніўшы цуд імем Маім, мог бы хутка зьняважыць Мянé.

40. Бо хто ня проці вас, той за вас.

41. І хто напоіць вас каўшóм вады́ дзеля Мянé, затым, што вы Хрыстовыя, запраўды́ кажу вам: ня страціць нагарóды сваé.

42. І хто зьвядзé аднаго з малых гэтых, вéручых у Мянé, таму лéпей было-б, каб павéсілі яму кáмень ад жóрнаў на шы́ю ды кінулі яго ў мора.

43. І калі зводзіць цябé рука твая, адсякі яé: лéпей табé калéкаму ўвайсьці ў жыцьцё, чымся з дзьвюмá рукамі йсьці ў геéнну, у вагонь неўгасаючы,

44. дзé чэрв іх ня ўмірае, і агонь не ўгасае.

45. І калі нагá твая зводзіць цябé, адсякі яé; лéпей табé ўвайсьці ў жыцьцё кульгáючы, чымся з дзьвюмá нагамі быць укіненым у геéнну, у вагонь неўгасáючы,

46. дзé чарвяк іх ня ўмірае, ды агонь не ўгасае.

47. калі вóка тваё зводзіць цябé, вырві яго: лéпей табé з адным вокам увайсьці ў царства Божае, чымся з дзьвюмá вачы́ма быць укіненым у геéнну вагнявую,

48. дзé чарвяк іх ня ўмірае, ды агонь не ўгасае.

49. Бо кожны агнём асоліцца, а ўсякая ахвяра соляй асоліцца.

50. Соль добрая; але, калі соль зробіцца несалóнай, чым яé паправіце? Мéйце ў сабé соль і мір мéйце між сабою.

## Разьдзéл 10.

1. І згэтуль, устаўшы, прыходзіць у мéжы Юдэйскія за Іорданам. І зноў зьбіраецца да Яго народ, і па звычáю свайму Ён ізноў навучаў іх.

2. І, падыйшоўшы, фарысэі спыталіся, спакушáючы Яго: ці можна мужу кінуць жонку сваю?



3. Ён жа, адкáзваючы, сказаў ім: што запавéдаў вам Майсéй?

4. Яны-ж сказалі: Майсéй дазволіў пісаць разводны ліст і разлучацца.

5. І, адкáзваючы, Ісус сказаў: дзеля жóрсткасьці сэрца вашага напісаў ён вам гэтую зáпаведзь

6. Бо на пачатку тварэньня Бог стварыў іх мужчынай і жанчынай (Быт. 1, 27).

7. Дзеля гэтага пакіне чалавéк айца свайго ды матку

8. і прыгóрнецца да жонкі сваёй, і ў двох будуць адно цéла (Быт. 2, 24), дык іх ужо ня двое, але адно цéла.

9. Вось жа, што Бог злучыў, чалавéк няхай не разлучае.

10. А дома вучні Яго ізноў спыталіся аб тым жа

11. І сказаў ім: хто пакіне жонку сваю ды ажэніцца з другою, той блудзіць з ёю;

12. і калі жонка разлýчыцца з мужам сваім ды вы́йдзе за другога, — блудзіць.

13. Прыносілі да Яго дзéтак, каб Ён дакранýўся да іх: вучні-ж ня пускалі тых, што прыносілі

14. Убачыўшы-ж гэтае, Ісус загнéваўся ды сказаў ім: дайце дзéткам ісьці да Мянé і не забараня́йце ім, бо гэткіх ёсьць царства Божае.

15. Запраўды́ кажу вам: хто ня пры́йме царства Божага, як дзіця, той ня ўвойдзе ў Яго.

16. І, абняўшы іх, усклаў на іх рукі і багаславіў іх.

17. І, калі выходзіў у дарогу, падбéг нéхта, упаў перад Ім на калéні і спытаўся ў Яго: Настаўніку добры! што мнé рабіць, каб унасьлéдаваць жыцьцё вéчнае?

18. Ісус жа сказаў яму: што завéш Мянé добрым? Ніхто ня добры, толькі адзін Бог.

19. Вéдаеш зáпаведзі: ня блудзі; не забівáй: не крадзі; ня сьвéдчы крыва; ня кры́ўдзь; паважáй бацькоў тваіх. (Выхад 20, 12—17).

20. Той жа, адкáзваючы, сказаў Яму: Настаўнік, усяго гэтага пілнаваўся я змалку дзён сваіх.

21. Ісус жа, глянуўшы на яго, упадабаў яго і сказаў яму: аднаго табé не хапáе: пайдзі, усё, што мáеш, прадáй ды раздай убогім, і будзеш мéць скарб на нéбе; і прыходзь, ідзі за Мною, узяўшы крыж.

22. Той жа, зьбянтэжаны гэтым словам, адыйшоўся засмучóны, бо мéў вялікую маéмасьць.

23. І, паглядзеўшы наўкола, Ісус кажа вучням Сваім: як цяжка багатым увайсьці ў царства Божае.

24. Вучні здумéліся ад слоў Яго. Але Ісус ізноў сказаў ім у адказ: дзéці! як цяжка ўвайсьці ў царства Божае тым, хто ўскладае надзéю на багацьце.

25. Зручней вярблюду прайсьці праз гóлчынае вýха, чымся багатаму ўвайсьці ў царства Божае.

26. Яны-ж балéй зьдзівіліся ды гаварылі між сабою: Хто-ж можа спасьціся?

27. Ісус, паўзіраўшыся на іх, кажа: у людзéй гэта немагчы́ма, але ня ў Бога; бо ў Бога ўсё магчыма.

28. І пачаў Пётр гаварыць Яму: вось мы пакінулі ўсё і пайшлі за Табою.

29. Ісус жа, адка́зваючы, сказаў: запраўды́ кажу́ вам: няма́ нікога, хто пакінуў бы дом, ці братоў, ці сёстраў, ці бацькоў, ці дзяце́й, ці зе́млі дзеля Мяне́ і Эва́нгельля

30. і не атрымаў бы цяпе́р, у гэты час, сярод перасьле́даваньня ў сто разоў бале́й дамоў, і братоў, і сёстраў, і бацькоў, і ма́так, і дзяце́й, і зе́мляў, а ў будучыне — жыцьця ве́чнага;

31. бо многія пе́ршыя будуць апошнімі, а апошнія пе́ршымі

32. Калі яны былі ў дарозе, ідучы ў Ерузалім, Ісус ішоў напе́радзе іх, а яны жа́халіся і, ідучы за Ім, былі ў страху. І, узяўшы ізноў дванаццацёх, пачаў ім гаварыць аб тым, што з Ім ма́е стацца

33. Вось, мы ўваходзім у Ерузалім, і Сын Чалаве́чы будзе вы́даны архірэям і кніжнікам, і засудзяць Яго на сьме́рць і вы́дадуць Яго паганам;

34. і назьдзе́куюцца над Ім, і будуць біць Яго і плява́ць на Яго, ды заб'юць Яго; і на трэці дзе́нь уваскрэсьне.

35. Тады падыйшлі да Яго Якаў і Іоан, сыны́ Завядзе́явы, ды сказалі: Вучыцель! мы хочам, каб Ты зрабіў нам, чаго папросім

36. Ён жа сказаў ім: што хочаце, каб Я зрабіў вам?

37. Яны-ж сказалі Яму: дай нам се́сьці ля Цябе́, аднаму з правага боку, а другому з ле́вага, у славе Тваёй

38. Але Ісус сказаў ім: ня ве́даеце, чаго просіце; ці-ж мо́жаце піць ча́ру, якую п'ю Я, і хрысьціцца хрышчэньнем, якім Я хрышчу́ся?

39. Яны адказалі: можам. Ісус жа сказаў ім: ча́ру, якую п'ю Я, піць будзеце;

40. але се́сьці ў Мяне́ з правага боку і з ле́вага — ня Мне́ дава́ць, але каму прыгато́вана.

41. І, пачуўшы, дзе́сяць пачалі злава́ць на Якава і Іоана.

42. Ісус, прыклікаўшы іх, сказаў ім: ве́даеце, што тыя, што лічацца князямі народаў, пануюць над народамі; і вялікія валадаюць імі;

43. у вас жа хай будзе ня гэтак: але хто хоча стацца вялікшым між вамі, няхай будзе вам служкаю,

44. і хто хоча ста́цца пе́ршым між вамі, хай будзе слугою ўсіх

45. Бо і Сын Чалаве́чы прыйшоў не́ каб Яму служылі, але каб паслужы́ць і аддаць душу Сваю на выкупле́ньне многіх.

46. І прыходзяць у Ерыхон. І, калі Ён выходзіў з Ерыхону з вучнямі Сваімі і множствам народу, сьляпы́ Варціме́й, сын Ціме́яў, сядзе́ў ля дарогі, жабру́ючы.

47. І, пачуўшы, што гэта Ісус Назарэй, ён пачаў крычэць і казаць: Ісу́се, сы́не Давідаў! зьмілуйся нада мною!

48. І многія сварэ́ліся на яго, каб замоўк, але ён яшчэ больш стаў крычэць: Сын Давідаў! зьмілуйся нада мною!

49. І Ісус, затрымаўшыся, сказаў паклікаць яго. І клічуць сьляпога і кажуць яму: ня бойся, уставай, кліча цябе.

50. Ён жа, скінуўшы з сябе́ вопратку, устаў і прыйшоў да Ісуса.

51. І, адка́зваючы яму, Ісус сказаў: што хочаш зрабіць табе́? Сьляпы́ сказаў Яму: Наставнік, каб мне́ ізноў відзець.



52. Ісус жа сказаў яму: ідзі, ве́ра твая зба́віла цябе́. І ён за́раз пачаў відзець і пайшоў за Ісусам па дарозе.

## Разьдзе́л 11.

1. І, калі падыйшлі да Ерузаліму, да Віфагіі і Віфані, да гары Аліўнай, Ісус пасылае двух вучняў Сваіх

2. і кажа ім: пайдзе́це ў сяло, што перад вамі; уваходзячы да яго, за́раз знойдзеце прывя́занае асьля́тка, на якога ніхто з людзе́й не сяда́ў; адвязаўшы яго, прывядзе́це.

3. І калі хто скажа вам: што вы гэта робіце? адказвайце, што ён патрэбны Госпаду: і за́раз пашле́ яго сюды.

4. Яны пайшлі і знайшлі асьля́тка, прывя́занае ля варот на вуліцы, і адвязалі яго.

5. І некаторыя, што тамака стаялі, гаварылі ім: што робіце? На што́ асьля́тка адвя́зваеце?

6. Яны адказалі ім, як загадаў Ісус; і тыя пусьцілі іх.

7. І прывялі асьля́тка да Ісуса і паклалі на яго сваё вопраткі, і Ён се́ў на яго.

8. І многія пасьцілалі адзе́жу сваю на дарозе, а іншыя рэзалі ве́цьце з дрэваў і ўсьцілалі ім дарогу.

9. І тыя, што йшлі перад і за Ім, крычалі, мовячы: Осанна! Багасла́ўлены, што йдзе́ ў імя Госпада!

10. Багаслаўлена царства айца нашага Давіда, якое йдзе́ ў імя Госпада! Осанна на вышыні!

11. І ўвайшоў Ісус у Ерузалім і ў сьвятыню; і, аглядзе́ўшы ўсё, выйшаў у Віфанію з дванаццацьма, бо час ужо быў позны.

12. І наза́ўтрае, як выйшлі яны з Віфаніі, захацеў Ён е́сьці.

13. І, угле́дзіўшы здалёк смакоўніцу, пакры́тую лісьцём, пайшоў, ці ня знойдзе на ёй што-не́будзь; але, падыйшоўшы да яе́, нічога не знайшоў, апрача лісьця́, бо ня час быў на смоквы.

14. І, прамовіўшы, сказаў да яе́ Ісус: Няхай ніхто з цябе́ да ве́ку ня е́сьць плоду! І чулі гэтае вучні Ягоныя.

15. І прыйшлі ў Ерузалім. І Ісус, увайшоўшы ў царкву́, пачаў выганяць купляўшых і прадаваўшых у царкве́; і паперавaро́чваў сталы́ мяня́льнікаў і ўсло́ны прадаўцоў галубоў;

16. і не дазволіў, каб хто праз царкву́ насіў хоць якое судзьдзё.

17. І навучаў, кажучы: ці-ж не напісана: дом Мой домам малітвы ўсімі народамі будзе назва́ны, а вы зрабілі яго прытонам разбойнікаў (Ісая 56, 7, Ерам. 7, 11).

18. І пачулі гэтае кніжнікі ды архірэі і шукалі, як загубіць Яго, бо баяліся Яго, што ўве́сь народ дзівіўся з навукі Ягонае.

19. І, як зрабілася позна, Ён выйшаў з ме́ста.

20. І раніцай, праходзячы міма, убачылі смакоўніцу, засохшы да караня́.

21. І, успо́мніўшы, Пётр кажа Яму: Раввіl глядзі, смакоўніца, якую Ты пракля́ў, засохла.

22. І, адказваючы, Ісус кажа ім:

23. Ме́йце ве́ру Божую. Бо запраўды́ кажу́ вам: калі хто скажа гарэ гэтай: узьніміся

і кіньсяў мора, і ня будзе сумлявацца ў сэрцы сваім, але веру мецьбудзе, станецца так, як гавора, — будзе яму, што-б ні сказаў.

24. Дзеля гэтага й кажу вам: усё, чаго-б вы ні прасілі ў малітве, верце, што дастанеце і будзе вам.

25. І калі стаіцё на малітве, даруйце, калі што маеце на каго, каб і Ацец ваш, што ў нябёсах, дараваў вам грахі вашыя.

26. Калі-ж вы не даруеце, то і Ацец ваш, што ў нябёсах, не даруе вам грахоў вашых.

27. І прыходзяць ізноў у Ерузалім. І, калі Ён хадзіў у царкве, падыйшлі да Яго архірэі і кніжнікі ды старшыны

28. і спыталіся ў Яго: якою ўладаю Ты гэтае робіш, і хто даў Табе ўладу рабіць гэтае?

29. Ісус жа адказаў ім, мовячы: спытаюся і Я ў вас адно слова: адкажэце Мне, тады і Я скажу вам, якою ўладаю гэтае роблю.

30. Хрышчэньне Іоанава з неба было, ці ад людзей? Адказвайце Мне.

31. Яны-ж разважалі між сабою: калі скажам: з неба, то Ён скажа: чаму-ж вы не паверылі яму?

32. А сказаць: ад людзей — баяліся народу, бо ўсе лічылі Іоана, што запраўды быў прарок.

33. І сказалі ў адказ Ісусу: ня ведаем. Тады Ісус адказаў ім: і Я не скажу вам, якою ўладаю гэтае роблю.

## Разьдзел 12.

1. І пачаў гаварыць да іх прыповесьцямі: чалавек насадзіў вінаграднік, абгарадзіў яго і выкапаў сток, ды пабудаваў вежу і аддаў вінаградарам, ды паехаў.

2. І паслаў у свой час да вінаградараў слугу ўзяць пладоў з вінаградніку.

3. Яны-ж схапілі яго, зьбілі дый адаслалі ні з чым.

4. І ізноў паслаў да іх другога слугу; і таму, кідаючы каменьні, разьбілі галаву і адаслалі, зьняважыўшы.

5. І ізноў новага паслаў; дый таго забілі, і шмат іншых, адных б'ючы, другіх забіваючы.

6. Маючы-ж яшчэ аднаго сына, любага яму, паслаў і яго да іх наканец, кажучы: паўстыдаюцца сына майго.

7. Але гэныя вінаградары сказалі паміж сабою: гэта наступнік; давайце, заб'ём яго, і спадчына будзе наша.

8. І, схапіўшы яго, забілі й выкінулі з вінаградніку.

9. Што-ж зробіць гаспадар вінаградніку? Прыйдзе і заб'ець вінаградараў і аддасьць вінаграднік другім.

10. Няўжо-ж вы ня чыталі гэтага пісаньня: камень, што адкінулі будаўнічыя, стаўся галавою кута;

11. ад Госпада сталася гэтае і дзіўна ў нашых вачох? (Псал. 117, 22—23).

12. І маніліся схапіць Яго, ды баяліся народу; бо ведалі, што гэтую прыповесьць сказаў да іх; і, пакінуўшы Яго, адыйшліся.

13. І пасылаюць да Яго некаторых з фарысэяў і ірадзіянаў, каб улавіць Яго на слове.

14. Тыя-ж, прыйшоўшы, кажуць Яму: Настаўніку! мы ведаем, што ты справядлівы і не дагаджаеш нікому: бо ня ўзіраешся на аблічча людзей, а напраўдзе шлях Божы пакауеш. Ці гожа даваць падатак кесару, ці не? Даваць нам, ці не даваць?



15. Ён жа, ведаючы крывадушнасьць іх, сказаў ім: што Мяне спакушаеце? Прынясеце Мне дынар, каб Я пабачыў.

16. Яны прынесьлі. І кажа ім: Чые гэта аблічча і надпіс? Яны адказалі: кесаравы.

17 І, адказваючы, Ісус сказаў ім: аддайце кесарава кесару, а Божае Богу. І дзівавалісяз Яго

18. Потым прыйшлі да Яго садукеі, якія кажуць, што няма ўваскрасеньня ўмёршых, і пыталіся ў Яго, кажучы:

19. Вучыцель! Майсей напісаў нам: калі ў каго памрэ брат і пакіне жонку, а дзяцей не пакіне, — каб брат яго ўзяў жонку ягоную і ўваскрасіў сёмя брату свайму. (Другазак. 25, 5.)

20. Вось жа было сем братоў: першы ўзяў жонку і, паміраючы, не пакінуў сямёньня.

21. І другі ўзяў яе і памёр, не пакінуўшы сямёньня: і трэці гэтак сама.

22. Бралі яе сямёра і не пакідалі сямёньня. Пасьля ўсіх памёрла й жана.

23. Дык у час уваскрасеньня, калі яны ўваскроснуць, якога з іх будзе яна жаною? Бо сямёра мелі яе за жану.

24. Ісус жа, адказваючы, сказаў ім: ці не дзеля таго вы блудзіце, што ня ведаеце пісаньняў, ні сілы Божай?

25. Бо, калі ўваскроснуць із мёртвых, тады ня будуць жаніцца, ні замуж выхадзіць, але будуць як ангелы, што ў нябёсах.

26. А аб умёршых, што яны ўваскроснуць, ці-ж вы ня чыталі ў кнізе Майсея, як Бог ля купіны сказаў яму: Я Бог Аўраама, і Бог Ізаака, і Бог Якава. (Выхад 3, 6).

27. Ня ёсьць Бог умёршых, але Бог жывых. Дык вы крэпка мыляецеся.

28. І кніжнік адзін, падыйшоўшы і пачуўшы спрэчкі іх, бачучы, што добра ім адказаў, спытаўся ў Яго: якая першая з усіх запаведзяў?

29. Ісус жа адказаў яму: першая з усіх запаведзяў: Слухай, Ізраіль! Госпад Бог наш ёсьць Госпад адзіны;

30. і: любі Госпада Бога твайго ўсім сэрцам тваім, і ўсёю душою тваёю, і ўсім розумам тваім, і ўсёю моцаю тваёю, — вось першая запаведзь (Другазак. 6, 4—5).

31. І другая падобная да яе: любі бліжняга твайго, як самога сябе. І няма шчака іншага вялікшага прыказаньня (Левіт 19, 18).

32. І сказаў яму кніжнік: добра, Вучыцель! Ты сказаў праўду, што адзін ёсьць Бог, і няма іншага апрача Яго;

33. і любіць Яго ўсім сэрцам, усім розумам і ўсёю душою і ўсёю сілаю і любіць бліжняга, як самога сябе, больш за ўсе агнявыя жэртвы й ахвяры.

34. І Ісус, бачучы, што той разумна адказвае, сказаў яму: недалёка ты ад царства Божага. І ніхто ўжо ня сьмеў задаваць Яму пытаньні.

35. І, азваўшыся, казаў Ісус, навучаючы ў царкве: Як кажуць кніжнікі: што Хрыстос ёсьць сын Давідаў?

36. Бо сам Давід сказаў Духам Сьвятым: сказаў Госпад Госпаду майму: сядзі направа

ад Мяне́, дакуль палажу во-
рагаў Тваіх за падножжа ног
Тваіх. (Псал. 109, 1).
37. Гэтак, сам Давід назы-
вае Яго Госпадам; дык як жа
Ён сын яго? І множства на-
роду з ахвотаю слу́хала Яго.
38. І гаварыў ім у навуцы Сва-
ёй: Сьцеражыцеся кніжнікаў,
што любяць хадзіць у даўгіх
во́пратках, ды вітаньні на тор-
жышчах,
39. і пе́ршыя лавы ў школах,
і пе́ршыя ме́сцы на банке́тах;
40. тыя, што зьяда́юць хаты
ўдоў і дзеля во́ка доўга моляц-
ца, тыя дастануць цяжэйшую
ка́ру.
41. І, се́ўшы ля скарбніцы,
глядзе́ў Ісус, як народ кідае
медзякі ў скарбніцу. І многа
заможных кідалі шмат.
42. І адна бе́дная ўдава, прый-
шоўшы, кінула дзьве́ ле́пты
або грош.
43. І, паклікаўшы вучняў
сваіх, Ісус сказаў ім: запраў-
ды кажу́ вам, што гэтая бе́дная
ўдава палажыла больш за
ўсіх, што клалі ў скарбніцу.
44. Бо ўсе́ клалі з лішкаў
сваіх, а яна з недастатку свай-
го палажыла ўсё, што ме́ла,
уве́сь пражытак свой.

### Разьдзе́л 13.

1. І, калі выходзіў Ён з царк-
вы, кажа Яму адзін із вучняў
Ягоных: Вучыцель! паглядзі,
якія каме́ньні і якія будынкі!
2. І, адказваючы, сказаў яму
Ісус: бачыш гэтыя аграмад-
ныя будыніны! Не астане́цца
ка́мень на ка́мені, які-б ня
зьбурылі.
3. І калі Ён сядзе́ў на гары
Аліўнай насупраць царквы,
пыталіся ў Яго насамо́це Пётр
і Якаў і Іоан і Андрэй:
4. скажы нам, калі гэтае бу-
дзе, і які знак, калі ўсяму гэ-
таму ма́е быць кане́ц?
5. І ў адказ ім Ісус пачаў
гаварыць: сьцеражыцеся, каб
хто ня зьвёў вас,
6. бо шмат прыйдзе пад Маім
імем і будуць гаварыць, што
гэта Я, і многіх зьвядуць.
7. Калі-ж пачуеце пра вой-
ны ды чуткі аб войнах, ня
трывожцеся: гэта мусіць стац-
ца; але гэта яшчэ не кане́ц.
8. Бо паўстане народ на на-
род і царства на царства, і бу-
дзе месцамі трасе́ньне зямлі,
і будзе голад і безгалоўе. Гэта
— пачатак злыбедаў.
9. Сьцеражыцеся-ж і вы самі:
бо будуць вас аддаваць пад
суд і біць вас у школах, і бу-
дзеце пастаўлены перад вая-
водамі ды цара́мі за Мяне́, каб
сьве́дчылі ім.
10. І пе́рш усім народам му-
сіць быць абве́шчана Эва́нгель-
ле.
11. Калі-ж павядуць вас,
каб выдаць, не́ клапо́цьцеся
напе́рад, што́ вам гаварыць, і
не абдумывайце, а што да́дзена
вам будзе ў той час, тое й га-
варыце, бо ня вы будзеце га-
варыць, але Дух Сьвяты.
12. І выдасьць брат брата на
сьме́рць, і бацька сына, і паў-
стануць дзе́ці на бацькоў сваіх
і забіваць іх будуць.
13. І будуць ненавідзець вас
усе́ за імя Маё, а хто выцяр-
піць да канца́, той спасе́цца.
14. Калі-ж угле́дзіце агіду
спусташэньня, аб чым казаў
Даніла прарок, паўстаўшую,
дзе́ ня сьле́д (хто чытае, разу-
ме́й), тады, хто будзе ў Юдэі,
хай бягуць на горы.
15. А хто на страсе́, хай ня



зыйдзе ў хату і ня йдзе браць
што-не́будзь з дому свайго.
16. І хто ў полі, хай не варо́-
чаецца наза́д узяць адзе́жу
сваю.
17. Гора-ж цяжа́рным і ко́р-
мячым у тыя дні!
18. Мале́цеся-ж, каб не да-
вялося ўцякаць вам зімою.
19. Бо будзе ў тыя дні туга́,
якое ня бывала ад пачатку
стварэньня, што стварыў Бог,
ажно дагэтуль, дый ня будзе.
20. І калі-б Госпад не ска-
раціў дзён гэных, то не спа-
сло́ся-б ніво́днае це́ла, але дзе-
ля выбраных, якіх Ён выбраў,
скараціў гэныя дні.
21. І калі хто вам тады ска-
жа: вось тут Хрыстос, ці: вось
там, — ня ве́рце.
22. Бо паўстануць лжэхры-
сты і лжэпраро́кі і дадуць зна-
ме́ньні і цу́ды, каб зьвясьці,
калі магчыма, і выбраных.
23 Вы-ж глядзіце: вось Я
ўсё вам сказаў напе́рад.
24. Але ў тыя дні, пасьля ту-
гі гэнае, сонца зьме́ркне, і ме́-
сяц ня дасьць сьятла́ свайго.
25. І зоркі будуць па́даць з
не́ба, і сілы, што на нябёсах,
пару́ханы будуць.
26. І тады ўгле́дзяць Сына
Чалаве́чага, ідучы на хмарах
з сілаю вялікаю і славаю.
27. І пашле́ Ён тады Ангелаў
Сваіх і зьбярэ выбраных Сваіх
ад чатырох вятро́ў, ад краю
зямлі да краю не́ба.
28. Ад смако́ўніцы вазьме́це
прыклад: калі гальлё яе́ ўжо
мякчэе і пускае лісьцё, то ве́-
дайце, што блізка ле́та.
29. Гэтак і вы: як угле́дзіце,
што гэта збыва́ецца, ве́дайце,
што блізка, ля дзьвярэй.
30. Запраўды кажу́ вам: ня
сцэзьне род гэты, як усё гэтае
ста́нецца.
31. Не́ба й зямля пяро́йдзе,
а словы Мае́ не пяро́йдуць.
32. А аб дні тым ніхто ня ве́-
дае: ні а́нгелы, што на не́бе, ні
Сын, а толькі Аце́ц.
33. Глядзіце, ня сьпіце ды
маліцеся, бо ня ве́даеце, калі
прыдзе час.
34. Як чалаве́к, што, выяж-
джа́ючы, пакінуў дом свой, даў
слугам сваім уладу і кожнаму
сваю работу, ды загадаў вар-
таўніку ля варот ня спаць.
35. Дык ня сьпіце-ж вы, бо ня
ве́даеце, калі прыйдзе гаспа-
да́р дому: уве́чары, ці апо́ў-
начы, ці пры пе́ўнях, ці нара́-
ніцы;
36. каб, прыйшоўшы неўспа-
дзе́ўкі, не знайшоў вас сплю-
чы.
37. А што вам кажу, кажу
ўсім: ня сьпіце.

### Разьдзе́л 14.

1. За два дні была Пасха і
сьвята праснакоў; і шукалі ар-
хірэі і кніжнікі, як узяць Яго
хітрасьцяй ды забіць.
2. Але казалі: толькі ня ў
сьвята, каб ня было разрухі
ў народзе.
3. І, як быў Ён у Віфаніі, у
доме Сымона пракажо́нага, ды
спачываў за сталом, — прый-
шла жанчына з алябастравым
збанко́м міра нардо́вага, чы-
стага й дарагога, ды, разьбіў-
шы судзіну, паліла Яму гала-
ву
4. І былі некаторыя, што гне́-
валіся ў сабе́ і гаварылі: на
што гэты глум міра?
5. Бо-ж можна было-б пра-
даць яго больш, як за трыста
дынараў, ды раздаць бе́дным.
І наракалі на яе́.

6. Але Ісус сказаў: пакіньце яе: на што ёй робіце прыкрасьць? Яна добрае дзéла зрабіла для Мяне.

7. Бо ўбогіх заўсёды маеце з сабою і можаце ім рабіць дабро, калі захочаце, а Мяне маеце не заўсёды.

8. Яна, што магла, зрабіла: наўпéрад памазала цéла Маё для пахаваньня.

9. Запраўды кажу вам: дзé толькі будзе абвéшчана Эвангельле гэтае па ўсім сьвéце дык і аб тым, што зрабіла яна, сказана будзе ў памяць аб ёй.

10. А Юда Іскарыёт, адзін з дванаццацёх пайшоў да архірэяў, каб прадаць Яго ім.

11. Яны-ж, пачуўшы, узрадаваліся і абяцалі даць яму грошы. І ён шукаў, як у адпавéдную часіну прадаць Яго.

12. І ў пéршы дзéнь праснакоў, калі рэзалі ягнё на Пасху, кажуць Яму вучні Ягоныя: дзé хочаш, каб мы пайшлі прыгатавалі Табé есьці пасху?

13. І пасылае двух з вучняў Сваіх і кажа ім: Ідзéце да мéста; і сустрэнецца вам чалавéк, нясучы гляк з вадою; ідзéце за ім.

14. І куды ён увойдзе, скажэце гаспадару таé хаты: Вучыцель пытáецца: дзé сьвятліца, у якой спажываціму пасху з вучнямі Маімі?

15. І ён пакажа вам пакой вялікі, засланы, гатовы; там прыгатуйце нам.

16. І пайшлі вучні Ягоныя і прыйшлі да мéста і знайшлі, як сказаў ім; і прыгатавалі пасху.

17. І, калі настаў вéчар, Ён прыходзіць з дванаццацьма.

18. І, як сядзéлі яны за сталом ды éлі, Ісус сказаў: запраўды кажу вам: адзін з вас, што éсьць са Мною, прадасьць Мяне.

19. Яны-ж пачалі сумаваць ды адзін праз аднаго казаці да Яго. ці ня я? І другі: ці ня я?

20. Ён жа, адказваючы, сказаў ім: адзін з дванаццацёх, што мачае са Мною ў місе.

21. Бо Сын Чалавéчы йдзé, як напісана аб Ім; але гóра таму чалавéку, праз якога прададзены будзе Сын Чалавéчы. Ляпéй было-б яму, калі-б чалавéк гэны не радзіўся.

22. І, калі яны éлі, Ісус, узяўшы хлéб, багаславіў яго ды, паламаўшы, даў ім і сказаў: вазьмéце, éшце; гэта ёсьць цéла Маё.

23. І, узяўшы чару й аддаўшы хвалу, падаў ім: і пілі яé ўсé

24. І сказаў ім: гэта ёсьць кроў Мая новага запавéту, што за многіх праліваецца.

25. Запраўды кажу вам: ніколі ўжо ня буду піць ад плóду вінаграднага ажно до таго дня, калі піць буду новае віно ў царстве Божым.

26. І, запяяўшы, пайшлі на гару Аліўную

27. І кажа ім Ісус: усé вы спакушаны будзеце ў гэту ноч за Мяне; бо напісана: ўдару пастуха, і рассыплюцца авéчкі (Захар. 13, 7).

28. Але, як уваскросну, апярэджу вас у Галілéі.

29. Пётр жа сказаў Яму: хай усé спакусяцца, але ня я.

30. І кажа яму Ісус: запраўды кажу табé, што ты сяньня, у гэтую самую ноч, пéрш, чым пéвень двойчы прапяé, тры разы адрачэшся ад Мяне.

31. Але той яшчэ больш казаў: хаця-б мне трэба было па-



мёрці разам з Табою, не адракуся ад Цябé. Гэтак сама гаварылі і ўсé.

32. І прыйшлі ў сяло, званае Гефсіманія, і сказаў вучням Сваім: пасядзéце тут, пакуль памалюся.

33. І бярэ з сабою Пятра, Якава ды Іоана; і найшоў жах дый тугá на Яго.

34. І кажа ім: сумная душá мая ажно да сьмéрці; пабудзьце гэтта і ня сьпіце.

35. І, адыйшоўшыся трохі, упаў на зямлю і маліўся, каб, калі магчыма, абмінула Яго гэтая гадзіна;

36. і гаварыў: Авва, Ойча! усё магчыма для Цябé, пранясі чáру гэтую міма Мяне; ды ня тое, чаго Я хачу, а чаго Ты.

37. І варóчаецца і знаходзіць іх сплючы, дый кажа Пятру: Сымоне! Ты сьпіш? Ня мог ты аднаé гадзіны ня спаць?

38. Ня сьпіце й маліцеся, каб не папáсьці ў пакусу: бо-ж дух крэпкі, а цéла слабое.

39. І ізноў, адыйшоўшыся, маліўся, гаворачы тое-ж слова.

40. І, вярнуўшыся, знайшоў іх ізноў сплючы; бо вóчы ў іх абцяжэлі, і ня вéдалі, што адказваць Яму.

41. І прыходзіць трэці раз і кажа ім: вы ўсё яшчэ сьпіцё і спачываеце? Годзе! Настаў час! Вось прадаéцца Сын Чалавéчы ў рукі грэшнікаў.

42. Уставайце! Хадзéм! Вось падыходзіць той, што прадаé Мяне.

43. І ўраз жа, як Ён яшчэ гаварыў, прыходзіць Юда, адзін з дванаццацёх, а з ім вялікая грамада з мячáмі ды калáмі ад архірэяў і кніжнікаў і старшых.

44. І той, што прадаваў Яго, даў ім знак, сказаўшы: каго я пацалую, Той і ёсьць; бярэце Яго й вядзéце асьцярожна.

45. І, прыйшоўшы, зáраз жа падыйшоў да Яго ды кажа: Раввí! Раввí! і пацалаваў Яго.

46. А яны ўзлажылі рукі сваé на Яго і ўзялі Яго.

47. Адзін жа із стаяўшых ля Яго, выхапіўшы мéч, удэрыў слугу архірэявага ды адсéк яму вуха.

48. І, азваўшыся, Ісус сказаў ім: быццам на разбойніка выйшлі вы з мячáмі й калáмі, каб схапіць Мяне.

49. Што-дзéнь быў Я з вамі ў царквé, навучáючы, і вы ня бралі Мяне; але няхай збудзецца, што напісана.

50. І ўсé, пакінуўшы Яго, паўцякалі.

51. І пайшоў за Ім адзін дзяцюк, што быў накінуўшы на сябé лёгкую тканіну на голае цéла; і жаўнéры схапілі Яго.

52. Але ён, пакінуўшы тканіну, голы ўцёк ад іх.

53. І прывялі Ісуса да архірэя; і сабраліся да яго ўсé архірэі і старшыны і кніжнікі.

54. Пётр жа здалёк ішоў за Ім ажно ў сярэдзіну на падворак архірэяў; і сядзéў з слугамі і грэўся ля вагня.

55. Архірэі-ж і ўвéсь сынэдрыон шукалі сьвядоцтва процi Ісуса, каб аддаць Яго на сьмéрць: і не знаходзілі.

56. Бо шмат хто сьвéдчыў ілжыва процi Яго, але нязгодныя былі між сабою сьвядоцтвы іхнія.

57. І некаторыя, падняўшыся, сьвéдчылі процi Яго ілжыва, кажучы:

58. Мы чулі, як Ён казаў: Я зруйную гэтую царкву, збудаваную рукамі, і цераз тры дні

збудую другую, нерукатворную.

59. Але і іхнія сьвядоцтвы ня выходзіліся.

60. Тады ўстаў архірэй пасярэдзіне ды спытаўся ў Ісуса. Нічога не адказваеш? Штó яны проці Цябé сьвéдчаць?

61. Але Ён маўчаў і не адказваў нічога. Ізноў архірэй спытаўся ў Яго, кажучы Яму: Ці Ты Хрыстос, Сын Бога Багаслаўленага?

62. Ісус адказаў: гэта Я; і вы ўбачыце Сына Чалавéчага, сядзючы направа ад сілы й ідучы на хмарах нябéсных

63. Тады архірэй, разьдзёршы вопраткі свае́, сказаў: на што нам яшчэ сьвéдкі?

64. Вы чулі хулý? Як вам здаéцца? Тыя-ж усе прысудзілі, што варт сьмéрці.

65. І пачалі іншыя пляваць на Яго і, закрываючы Яму аблічча, біць Яго ды гаварыць Яму: прарoч! І слугі білі Яго па шчóках.

66. І, калі Пётр быў на дварэ, унізе, прыйшла адна з дзяўчатак архірэйскіх

67. і, убачыўшы Пятра, што ён грэецца, прыглéдзіўшыся да яго, сказала: і ты быў з Ісусам Назаранінам.

68. Але ён адрокся, кажучы: ня вéдаю і не разумéю, што гаворыш. І выйшаў на пярэдні падворак; і прапяяў пéвень.

69. Дзяўчынка-ж, ізноў убачыўшы яго, пачала казаць стаяўшым навакол: гэты із іх.

70. Ён жа ізноў адрокся. І, крыху счакаўшы, стаяўшыя наўкола ізноў пачалі гаварыць Пятру: праўда, што ты із іх: бо ты і галілéянін, і гутарка твая падобная.

71. А ён пачаў клясьціся ды прысягáцца: ня вéдаю чалавéка гэнага, аб якім гаворыце.

72. Тады другі раз прапяяў пéвень. І ўспомніў Пётр слова, што сказаў яму Ісус: пéрш, чым пéвень двойчы прапяé, тры разы адрачэшся ад Мянé. І пачаў плакаць.

## Разьдзéл 15.

1. І ўраз нарáніцы зрабіўшы нараду, архірэі з старшынамі ды кніжнікамі і ўвéсь сынэдрыон, зьвязаўшы Ісуса, завялі ды аддалі Пілату.

2. І спытаўся ў Яго Пілат: Ты цар Юдэйскі? Ён жа адказаў яму: ты кажаш.

3. І многа ўзводзілі на Яго архірэі.

4. А Пілат ізноў спытаўся ў Яго: Ты нічога не адказваеш? Глядзі, колькі сьвéдчаць проці Цябé.

5. Але Ісус і на гэта нічога не адказаў, ажно зьдзівіўся Пілат.

6. На ўсякае-ж сьвята звальняў ён ім аднаго із вязьняў, за якога прасілі.

7. Быў жа ў вязьніцы нейкі Варавва з сваімі супольнікамі, якія ў часе бунту ўчынілі забойства.

8. І народ, падняўшы крык, пачаў прасіць Пілата, каб зрабіў ім, як заўсёды.

9. Пілат жа адказаў ім, кажучы: хочаце, звольню вам Цара Юдэйскага?

10. Бо вéдаў, што архірэі дзеля зáвісьці вы́далі Яго.

11. Але архірэі падбілі народ на тое, каб звольніў ім лéпей Варавву.

12. І Пілат, азваўшыся ізноў, сказаў ім: Што-ж хочаце, каб я зрабіў з Тым, каго называеце Царом Юдэйскім?



13. Яны ж ізноў закрычэлі: распні Яго!

14. Пілат жа сказаў: што-ж благое ўчыніў Ён? Але яны яшчэ мацнéй крычалі: распні Яго!

15. Тады Пілат, хóчучы дагадзіць народу, звольніў ім Варавву, а Ісуса аддаў, пасьля бічаваньня, расьпяць.

16. І жаўнéры завялі Яго ў панадворак, што завéцца Прэторыя, і склікалі ўсю роту.

17. І адзéлі Яго ў пýрпур і, сплёўшы з цéрняў вянок, узлажылі на Яго.

18. І пачалі вітаць Яго: Радуйся, Цар Юдэйскі!

19. І білі Яго па галавé трысьцінай, і плявалі на Яго, і, становячыся на калéні, пакланяліся Яму.

20. І, як насьмяяліся з Яго, зьнялі пýрпур ды адзéлі Яго ў уласную вопратку, і павялі Яго, каб расьпяць Яго.

21. І прымусілі нéйкага Сымона Кіранэйца, бацьку Аляксандра й Руфа, які йшоў з поля, каб нёс крыж Ягоны.

22. І прывялі Яго на Галгофу, мéсца, якое называецца Мéсца Чарапоў.

23. І давалі Яму піць віно з сьмірнаю, але Ён ня ўзяў.

24. І, расьпяўшы Яго, падзялілі вопратку Ягоную, кідаючы жэрабе, каму што ўзяць.

25. Была трэцяя гадзіна, і расьпялі Яго на крыжу.

26. І быў надпіс віны Ягонае напісаны: Цар Юдэйскі.

27. І з Ім расьпялі двух разбойнікаў, аднаго з правага, а другога з лéвага боку Яго.

28. І збылося пісаньне, што гаварыла: і да злачы́нцаў залічаны (Ісая 53, 12).

29. І праходзячыя міма зьне괍важалі Яго, ківаючы галавамі сваімі ды кажучы: о, Ты, што цэркву руйнуеш і ў тры дні адбудоўваеш!

30. Спасі Сябé Самога і зыйдзі з крыжа!

31. Падобна-ж і архірэі, насьмяхаючыся, гаварылі з кніжнікамі адзін да аднаго: другіх спасаў, Сябé-ж спасьці ня можа!

32. Хрыстос, Цар Ізраіляў, няхай зыйдзе цяпéр з крыжа, каб мы бачылі ды павéрылі! І расьпятыя разам з Ім зьневажалі Яго.

33. І а шостай гадзіне настала цéмра па ўсёй зямлі ажно да дзявятае гадзіны.

34. І а дзявятай гадзіне загаласіў Ісус моцным голасам: Элоі, Элоі! ламма сабахтані! што абазначае: Божа Мой, Божа Мой! на што Ты Мянé пакінуў?

35. І некаторыя із стаяўшых наўкола, пачуўшы, казалі: вось Ільлю кліча.

36. Адзін жа, пабéгшы й набраўшы ў губку воцату ды насадзіўшы яé на трысьціну, паіў Яго, кажучы: чакайце! паглядзімо, ці прыйдзе Ільля зьняць Яго?

37. Ісус жа, загаласіўшы моцным голасам, сканáў.

38. І заслона ў царквé разьдзéрлася надвое ад вéрху да нізу.

39. Сотнік жа, што стаяў насупраць Яго, углéдзіўшы, што так загаласіўшы сканáў, сказаў: запраўды́, чалавéк гэты быў Сын Божы.

40. Былі тут і жанчыны, што глядзéлі здалёк; між імі была і Марыя Магдаліна, і Марыя, маці Якава мéншага ды Есіі, і Салямэя,

41. якія і тады, як быў у Галілеі, ішлі за Ім ды служылі Яму; і многа іншых, што прыйшлі з Ім у Ерузалім.
42. І, як ужо настаў вечар, (а была параскева, значыць перадсуботнік),
43. прыйшоў Язэп з Арыматэі, выдатны раднік, які й сам ждаў царства Божага, і сьмела ўвайшоў да Пілата і прасіў цела Ісусавага.
44. І Пілат зьдзівіўся, што Ён ужо памёр, і, клікнуўшы сотніка, спытаўся ў Яго, ці даўно памёр?
45. І, даведаўшыся ад сотніка, аддаў цела Язэпу.
46. І, купіўшы сіндон ды зьняўшы Яго, абвіў сіндонам і палажыў Яго ў магілу, што была высечана ў скале, ды прываліў камень да дзьвераў магілы.
47. А Марыя Магдаліна і Марыя Есіява глядзелі, дзе Яго палажылі.

## Разьдзел 16.

1. І, калі прыйшла субота, Марыя Магдаліна і Марыя Якавава і Салямэя купілі пахнідлаў, каб пайсьці памазаць Яго.
2. І дужа рана, у першы дзень тыдня, прыходзяць да магілы на ўсходзе сонца.
3. І гаварылі між сабою: хто адваліць нам камень ад дзьвераў магілы?
4. І, глянуўшы, бачаць камень адвалены, а быў ён надта вялікі.
5. І, увайшоўшы ў магілу, убачылі дзяцюка, седзячы з правага боку й адзетага ў белую шату. І спалохаліся.
6. Ён жа кажа ім: Не палохайцеся! Шукаеце Ісуса Назарэя, расьпятага на крыжу? Ён уваскрос; Яго няма тут. Вось месца, дзе палажылі Яго.
7. Дык ідзеце, скажэце вучням Яговым і Пятру, што йдзе перад вамі ў Галілею; там Яго пабачыце, як сказаў вам.
8. І, выйшаўшы, пабеглі ад магілы; і зьняла іх дрыготка, і нікому нічога не сказалі, бо баяліся.
9. Уваскросшы-ж раніцаю ў першы дзень тыдня, Ісус паказаўся сьперша Марыі Магдаліне, з якое выгнаў сем дэманаў.
10. Яна, пайшоўшы, абвясьціла тым, што былі з Ім, ды плакалі й галасілі.
11. І яны, пачуўшы, што Ён жывё й быў бачаны ёю, не паверылі.
12. Пасьля гэтага паказаўся ў іншым выглядзе двум із іх у дарозе, як ішлі ў веску.
13. І тыя, вярнуўшыся, абвясьцілі ўсім іншым, але й ім не паверылі.
14. Урэшце паказаўся самым адзінаццацём, як спачывалі за сталом, і карыў іх за няверу й жорсткасьць сэрца, што не паверылі бачыўшым Яго ўваскросшага.
15. І сказаў ім: ідзеце па ўсім сьвеце і абвяшчайце Эвангельле ўсякаму стварэньню.
16. Хто паверыць і ахрысьціцца, спасён будзе; хто-ж не паверыць, засуджаны будзе.
17. А паверыўшым будуць гэткія знаменьні: імем Маім дэманаў выганяцімуць, новымі мовамі гаварыць будуць;
18. зьмеяў браць будуць, ды хоць бы штось сьмяротнае выпілі, не пашкодзе ім; палажаць рукі на хворых, дык здаровымі будуць.



19. Госпад жа пасьля гутаркі з імі ўзьнёсся на неба і сеў направа ад Бога.
20. Яны-ж, выйшаўшы, прапаведывалі ўсюды з дапамогай Госпада, сцьвярджаўшага ўсьлед слова іхняе знаменьнямі. Амін.

## Разьдзел 1.

1. На пачатку было Слова, і Слова было ў Бога, і Богам было Слова.
2. Яно было ў Бога спрадвеку.
3. Усе праз Яго сталася, і без Яго нічога ня было з таго, што сталася.
4. У Ім жыцьцё было, і жыцьцё было сьвятлом для людзей.
5. І сьвятло ў цемры сьвеціць, а цемра не агарнула яго.
6. Быў чалавек, пасланы ад Бога; імя яго Іоан.
7. Ён прыйшоў дзеля сьведчаньня, каб сьведчыў аб сьвятле, каб усе мелі веру праз Яго.
8. Ня быў ён сьвятлом, але каб сьведчыў аб Сьвятле.
9. Было Сьвятло праўдзівае, якое прасьвячае ўсякага чалавека прыходзячы ў сьвет.
10. Было Яно на сьвеце, сьвет праз Яго стаўся, і сьвет Яго не пазнаў.
11. Да сваіх прыйшло, і свае Яго ня прынялі.
12. А тым, што прынялі Яго, веруючым у імя Яго, дало Яно Ім сілу дзяцьмі Божымі стацца, тым, якія веруюць у імя Яго,
13. тым, што не ад крыві, не ад жаданьня цела, не ад жаданьня мужа, але ад Бога нарадзіліся.
14. І Слова целам сталася і пасялілася між нас, (і бачылі мы славу Яго, славу, як Адзінароднага ад Айца), поўнае ласкі і праўды.
15. Іоан сьведчыць аб Ім і голасна кажа: Гэта Той, пра Якога я сказаў: Той, што пасьля мяне йдзе, Ён наперадзе мяне стаў, бо раней за мяне быў.
16. І ад поўнасьці Яго усе мы прынялі ласку на ласку;
17. бо закон быў дадзены праз Майсея, ласка-ж і праўда сталіся праз Ісуса Хрыста.
18. Бога ня бачыў ніхто нікалі; Адзінародны Сын, што ў улоньні Айца, Той зьявіў.
19. І вось сьведчаньне Іоана, як Жыды паслалі з Ерузаліму сьвяшчэньнікаў і лявітаў, каб спыталіся ў яго: хто ты?
20. Ён сказаў і ня зрокся, і сказаў: я ня Хрыстос.
21. І пыталіся ў яго: дык хто-ж? ты Ільля? І сказаў: не. Прарок? І адказаў: не.
22. Дык сказалі яму: хто-ж ты? каб нам даць адказ тым, што нас паслалі: што ты кажаш аб самым сабе?
23. І сказаў: я голас гукаючага ў пустыні: Прастуйце шлях Госпаду, як сказаў прарок Ісая (Ісая 40, 3).
24. А пасланыя былі ад фарысэяў.
25. І спыталіся ў яго: Дык што-ж ты хрысьціш, калі ты ня Хрыстос, ані Ільля, ані прарок?
26. Іоан сказаў ім у адказ: я

хрышчу вадой, але паўстаў ся-
род вас, Каго вы ня ведаеце;
27. гэта Той, што йдзе за
мною, але напéрадзе мянé быў,
Якому я ня варты разьвязаць
рамéнь абуцьця Яго.
28. Ста́лася гэта ў Віфавары,
за Іорданам, дзé хрысьціў
Іоан.
29. На другі дзéнь бачыць
Іоан Ісуса ідучы да яго і кажа:
вось Ягня Божае, што бярэ
на Сябé грахі ўсяго сьвéту.
30. Гэта Той, аб Якім я ска-
заў: ідзé за мною Муж, Які
стаў напéрадзе мянé, бо ранéй
за мянé быў;
31. і я ня вéдаў Яго; але, каб
зьявіўся Ізраілю, прыйшоў я,
хрысьцячы вадой.
32. І сьвéдчыў Іоан, кажучы:
я бачыў Духа, зыходзячы з
нéба, як галуб, і стаў Ён над
Ім.
33. І я ня вéдаў Яго; але Той,
што паслаў мянé хрысьціць
вадой, сказаў мнé: на каго
углéдзіш зыхо́дзячы Духа, Гэ-
ты і ёсьць Той, што Духам
Сьвятым хрысьціць.
34. І я бачыў і засьвéдчыў,
што гэты ёсьць Сын Божы.
35. На другі дзéнь ізноў стаяў
Іоан і двое з вучняў яго.
36. І, углéдзіўшы, што йдзе
Ісус, сказаў: вось Ягня Божае!
37. І пачулі двое з вучняў яго,
як казаў гэтае, і пайшлі за Ісу-
сам.
38. Ісус жа, аглянуўшыся і
ўглéдзіўшы, што йдуць за Ім,
кажа ім: чаго шука́еце? Яны
адказалі Яму: Раввi! (г. е. ву-
чыцель) — дзé жывéш?
39. Кажа ім: пайдзéце і ўба-
чыце. Яны пайшлі і ўбачылі,
дзé Ён жывé, і астава́ліся ў
Яго гэты дзéнь. Было-ж каля
дзесятае гадзіны.
40. Адзін з двох, што чулі ад
Іоана і пайшлі за Ісусам, быў
Андрэй, брат Сымона Пятра.
41. Ён пéршы знаходзіць бра-
та свайго Сымона і кажа яму:
мы знайшлі Мэсію (што азна-
чае Хрыста).
42. І прывёў яго да Ісуса.
Ісус жа, глянуўшы на яго, ска-
заў: Ты Сымон, сын Іонін, ты
назавéшся Кіфа, што значыць
ка́мень (Пётр)
43. На другі дзéнь Ісус ха-
цéў ісьці ў Галілéю і знахо-
дзіць Піліпа ды кажа яму: ідзі
за Мною.
44. Піліп жа быў з Віфсаіды,
з мéста Андрэя і Пятра.
45. Піліп знаходзіць Ната-
наіла і кажа яму: мы знай-
шлі Таго, аб Кім пісаў Май-
сéй у законе і прарокі: Ісуса,
Сына Язэпавага, што з Наза-
рэту.
46. Але Натанаіл сказаў яму:
ці-ж можа быць што́ добрае з
Назарэту? Піліп кажа яму:
пайдзі ды паглядзі.
47. Ісус, углéдзіўшы Ната-
наіла, як ішоў да Яго, кажа аб
ім: вось, запраўды, ізраільця-
нін, у якім няма няшчырасьці.
48. Натанаіл кажа Яму:
скуль вéдаеш мянé? Ісус ад-
казаў і сказаў яму: пéрш, чым
Піліп паклікаў цябé, я бачыў
цябé, як ты быў пад смакоўні-
цаю.
49. І кажа Яму Натанаіл:
Раввi! Ты Сын Божы! Ты —
Цар Ізраіляў!
50. Ісус у адказ сказаў яму:
вéрыш, бо Я сказаў табé: Я
бачыў цябé пад смакоўніцаю;
убачыш больш за гэтае.
51. І кажа яму: запраўды,
запраўды кажу вам: адгэтуль
будзеце бачыць нéба адчыне-
нае і ангелаў Божых узыхо-



дзячы і сходзячы ўніз да Сына
Чалавéчага

## Разьдзéл 2.

1. На трэці дзéнь было вя-
сéльле ў Кане Галілéйскай, і
Маці Ісусава была там.
2. Быў запро́шаны і Ісус і ву-
чні Яго на вясéльле.
3. І, як не хапіла віна, Маці
Ісусава кажа Яму: віна ня ма-
юць.
4. Кажа ёй Ісус: што Мнé і
Табé жанчына? Гадзіна Мая
яшчэ ня прыйшла.
5. Маці Яго сказала слугам:
што вам скажа, зрабéце.
6. Было-ж тамака шэсьць ка-
мéнных судзін да вады, якія
стаялі дзеля жыдоўскага ачы-
шчэньня, зьмяшчаючы па
дзьвé, ці па тры мéры.
7. Кажа ім Ісус: налійце ва-
ды у глякі. І напоўнілі іх да
вéрху.
8. І кажа ім: чарпайце цяпéр
і нясéце да маршалка. І па-
нясьлі.
9. Калі-ж маршалак пака-
штаваў вады, што віном стала-
ся, а ён ня вéдаў, скуль яно,
слугі-ж, што налівалі ваду, вé-
далі, — кліча маладога
10. і кажа яму: кожын чала-
вéк пéрш падае добрае віно, а
як нап'юцца, тады го́ршае; ты-
ж добрае віно захаваў дагэ-
туль.
11. Так зрабіў Ісус пачатак
цудам у Кане Галілéйскай і
выявіў славу Сваю, і ўвéравалі
ў Яго вучні Яго.
12. Пасьля гэтага прыйшоў
Ён у Капэрнаум, Сам і Маці
Яго, і браты Яго, і вучні Яго,
і там аставаліся нéкалькі дзён,
13. І была блізка Пасха ў Жы-
доў, і ўвайшоў Ісус у Ерузалім;
14. і знайшоў у царквé пра-
даваўшых валоў, авéц, галу-
боў, і сядзéлі тамака мянялы.
15. І, зрабіўшы біч з вяровак,
выгнаў з царквы ўсіх, такжа
й авéц і валоў, ды грошы мя-
нялам рассыпаў і сталы іх
абярнуў;
16. і сказаў прадаўцом галу-
боў: забярэце гэнае згэтуль:
не рабéце дому Айца Майго
домам торгу.
17. І прыпомнілі вучні Яго,
што напісана: руплівасьць аб
дом Твой зьядае Мянé (Пс.
68, 10).
18. Адказалі-ж Яму Жыды і
сказалі: які знак нам дасі, ча-
му гэтае робіш?
19. Ісус жа адказаў ім, мовя-
чы: зруйнуйце дом гэты, і Я ў
тры дні адбудую яго.
20. І сказалі Жыды: гэты дом
будаваўся сорак шэсьць га-
доў, а Ты ў тры дні збудуеш
яго?
21. А Ён гаварыў гэтае аб до-
ме цéла Свайго.
22. І, як уваскрос пасьля
сьмéрці, прыпомнілі вучні Яго,
што Ён казаў гэтае, і павéрылі
Пісаньню і слову, якім мовіў
Ісус.
23. Калі-ж быў Ён у Ерузалі-
ме на Пасху ў сьвяты, дык мно-
гія, бачучы цуды, якія рабіў,
увéравалі ў імя Яго.
24. Але Сам Ісус не давé-
рыўся ім, бо вéдаў усіх
25. і ня мéў патрэбы, каб хто
сьвéдчыў аб чалавéку, бо Сам
вéдаў, што было ў чалавéку.

## Разьдзéл 3.

1. Быў жа між фарысэямі ча-
лавéк, на імя Нікадэм, адзін з
начальнікаў жыдоўскіх.
2. Той прыйшоў да Ісуса ўна-
чы і сказаў Яму: Раввi! мы вé-
даем, што Ты вучыцель, што

прыйшоў ад Бога, бо ніхто ня
можа рабіць такіх цудаў, якія
Ты робіш, калі-б ня быў з ім
Бог.
3. І адказаў яму Ісус і сказаў:
запраўды, запраўды кажу та-
бé: калі хто не народзіцца на-
нова, ня можа бачыць Царства
Божага.
4. Нікадэм кажа Яму: як мо-
жа чалавéк нарадзіцца, калі
ён стары? Няўжо-ж ён другі
раз можа ўвайсьці ў чэрава
маткі сваёй і нарадзіцца?
5. Ісус адказаў: запраўды,
запраўды кажу табé: калі хто
не народзіцца з вады і Духа,
ня можа ўвайсьці ў Царства
Бажае.
6. Спараджонае з цéла ёсьць
цéла, а спараджонае з Духа
ёсьць дух.
7. Ня дзівуйся, што Я ска-
заў табé: трэба вам нарадзіцца
нанова.
8. Дух дыхае, дзé хоча, і го-
лас яго чуеш, а ня вéдаеш,
скуль прыходзіць і куды ады-
ходзіць: гэтак і ўсякі спара-
джоны з Духа.
9. Нікадэм адказаў і сказаў
Яму: як гэта можа быць?
10. Ісус адказаў яму і сказаў:
ты вучыцель Ізраіляў і гэтага
ня вéдаеш?
11. Запраўды, запраўды ка-
жу табé: Мы гаворым аб тым,
што вéдаем, і сьвéдчым аб тым,
што бачылі, і вы сьвéдчаньня
Нашага ня прыймаеце;
12. калі Я сказаў вам аб зям-
ным, і ня вéрыце, як павéрыце,
калі буду гаварыць аб нябéс-
ным?
13. І ніхто ня ўзышоў на нé
ба, толькі Сын Чалавéчы, што
на нéбе, які з нéба зыйшоў.
14. І, як Майсéй падняў зьмéя
ў пустыні, так мусіць быць
падняты Сын Чалавéчы,
15. каб усякі, хто вéрue ў
Яго, ня згінуў, але мéў жыць-
цё вéчнае.
16. Бо так палюбіў Бог сьвéт,
што аддаў Сына Свайго Адзі-
народнага, каб усякі, хто вé-
рue ў Яго, ня згінуў, але мéў
жыцьцё вéчнае.
17. Бо не паслаў Бог Сына
Свайго ў сьвéт, каб судзіць
сьвéт, але каб сьвéт быў збаў-
лены праз Яго.
18. Хто вéрue ў Яго, ня бу-
дзе асуджаны, а хто ня вéрue,
той ужо засуджаны, бо ня ўвé-
раваў у імя Адзінароднага
Сына Божага.
19. Суд жа такі, што Сьвятлó
прыйшло ў сьвéт, але людзі
палюбілі цéмру больш за сьвят-
ло, бо ўчынкі іх былі благія.
20. Бо кожын, хто робіць бла-
гое, ненавідзіць сьвятлá і ня
йдзé да сьвятлá, каб ня выяві-
ліся ўчынкі яго, бо яны благія.
21. А хто чыніць праўду,
ідзé да сьвятлá, каб відóчнымі
былі ўчынкі яго, бо яны ў Богу
ўчынены.

Valk. Ven. Mark.

Työväen Kirjapaino, Helsinki.